Сакі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Смак традыцыі ☞ 5

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 35 (2729) Год LIII | Беласток, 31 жніўня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Спрэчка, здаецца, на фінішы?

— Такіх добрых размоў ад гадоў ужо не было, — так аб шляху да паразумення паміж Праваслаўнай і Грэка-каталіцкай цэрквамі, у якім негацыятарам з'яўляецца польскі ўрад, сказаў „Ніве" сямятыцкі епіскап Георгій, сакратар Праваслаўнай мітраполіі. Тым часам Хельсінскі фонд правоў чалавека канфлікт паміж грэка-каталікамі і праваслаўнымі на права да 24 храмаў у паўднёва-ўсходняй частцы Польшчы палічыў за „адзін з нешматлікіх у сённяшняй Польшчы міжканфесійных канфліктаў".

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Нерухомасці (або іх часткі), якія знаходзяцца ў юрыдычным валоданні цэркваў, пасля ўступлення ў сілу адпаведных законаў аб адносінах РП і паасобных Касцёлаў станавіліся іх уласнасцю. Датычыла гэта таксама Польскай праваслаўнай аўтакефальнай царквы (за прыняцце гэтага закону змагаўся ў Сейме падляшскі дэпутат Яўген Чыквін). Аднак была зроблена агаворка, што не датычыць гэта больш чым дваццаці пасляўніяцкіх храмаў, якія былі ў валоданні праваслаўных якраз у паўднёва-ўсходняй Польшчы. Гэтыя пытанні меў вырашыць асобны закон.

— У законе ад 1991 г. быў запіс аб перайманні храмаў згодна з юрыдычнымі нормамі. Дэталёвыя рэгуліроўкі былі змешчаны ў двух ці трох асобных пасольскіх законапраектах, якія, аднак, Сейм адхіліў. Ніводзін з урадаў у сваю чаргу не падаў уласнага праекта, — тлумачыў „Ніве" мітрафорны протаіерэй Георгій Тафілюк, рэктар Праваслаўнай духоўнай семінарыі ў Варшаве, адзін з членаў супольнай камісіі, сабранай для вырашэння спрэчкі паміж грэка-каталікамі і праваслаўнымі. Заявіў ён, што між іншым таму Праваслаўная царква накіравала скаргу ў Еўрапейскі трыбунал правоў чалавека ў Страсбург.

Раней, аднак, у сувязі з крытычна ацэньванымі некаторымі нармалізацыйнымі развязкамі, датычнымі маёмасных спраў, мітрапаліт варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава накіраваў скаргу ў польскі Канстытуцыйны трыбунал. Пасля больш чым года з моманту падачы заявы (красавік 2003 г.) Канстытуцыйны трыбунал адкінуў усе прадстаўленыя мітрапалітам аргументы, палічыўшы правілы згоднымі з Канстытуцыяй. Таксама таму скарга была Праваслаўнай царквой амаль адразу перададзена на разгляд Еўрапейскага трыбунала.

Айцец рэктар Г. Тафілюк адзначыў:

— У аргументацыі скаргі ў Страсбург мы спасылаліся м.інш на няроўнае трактаванне Касцёлаў у Польшчы.

Еўрапейскі трыбунал меў разгледзець скаргу 17 чэрвеня гэтага года (больш чым праз пяць гадоў!). Аднак яна не разглядалася, бо цяперашні ўрад Польшчы звярнуўся з просьбай адтэрмінаваць справу, паколькі хоча быць пасрэднікам у заключэнні паразумення паміж Праваслаўнай царквой і грэка-каталікамі. Перагаворы яшчэ працягваліся, калі мы рыхтавалі гэты нумар „Нівы" ў друк. Раней епіскап Георгій падзяліўся з намі сваёй думкай наконт вынікаў працы гэтай супольнай камісіі:

— Мы вельмі добрай думкі. Пытанне дваццаці храмаў ужо вырашана. Галоўным чынам застаецца пытанне Гары Явар. Грэка-каталікі не хочуць тут уступіцца (рашуча патрабуюць вярнуць сабе гэты праваслаўны санктуарый — М. Х.). З нашага боку мы адышлі ад усіх засцярог.

Як сказаў нам сакратар Праваслаўнай мітраполіі, прыхільнасць цяперашняга ўрада спрычынілася таксама да станоўчага вырашэння пытанняў, звязаных з днямі вольнымі ад навукі ў школах у час праваслаўных святаў, а таксама карэктуры ў школьных падручніках па гісторыі:

— Маем уплыў на змест гэтых падручнікаў. Справа ў тым, каб не было скажэнняў на-

працяг ☞ 9

Гара Явар

Нацыя самазабойцаў? ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Цягам апошніх дзесяці гадоў Беларусь выйшла ў сусветныя лідары па колькасці самагубстваў. Даследчыкі адзначаюць, што іх ровень вялікі ва ўсіх краінах рэгіёна, але Беларусь за апошні перыяд абагнала ўсіх па гэтым сумным паказніку. Навукоўцы тлумачаць такую сітуацыю сталым ростам ужывання алкаголю, суб'ектыўным адчуваннем браку жыццёвых перспектыў...

А гады плывуць і плывуць... ☞ 2

Васіль САКОЎСКІ

Кожны этап людскога кругавароту нясе ў сабе як мілыя, так і цяжкія сюрпрызы. Падобна бывае і з цэлымі грамадствамі. Праходзяць і яны праз этапы ці перыяды — і гэтыя перыяды могуць у іх быць лепшыя ці горшыя...

Моладзь з Седльцаў у Ваўкавыску ☞ 5

(аб)

Рэканструкцыя даўніны ☞ 9

Міхал МІНЦЭВІЧ

Генё на шэнгенскай мяжы ☞ 12

Міра ЛУКША

Нацыя самазабойцаў?

Цягам апошніх дзесяці гадоў Беларусь выйшла ў сусветныя лідары па колькасці самагубстваў. Даследчыкі адзначаюць, што іх ровень вялікі ва ўсіх краінах рэгіёна, але Беларусь за апошні перыяд абагнала ўсіх па гэтым сумным паказніку. Навукоўцы тлумачаць такую сітуацыю сталым ростам ужывання алкаголю, суб'ектыўным адчуваннем браку жыццёвых перспектыў, дэпрэсіўным асяроддзем і нізкімі выдаткамі на культуру. Менавіта гэтыя фактары найперш уплываюць на крок чалавека да вялікага смяротнага граху. Самагубства аднаго чалавека — гэта асабістая трагедыя аднаго чалавека, бяда і гора канкрэтнай сям'і гэтага чалавека. А што, калі на мяжы самагубства пастаўлена цэлая дзяржава, цэлы народ? Дзяржаўны курс, які праводзіцца ў Беларусі ў найноўшай гісторыі, выразна скіраваны на знішчэнне беларускай мовы, беларускай культуры, нацыянальнай ідэнтычнасці, адметнасці. Беларусаў хочуць знішчыць і пастаянна штурхаюць на край пагібелі. І цэлы час вісіць пагроза паглынання Беларусі імперскай Расіяй, якая ўжо распрастала драпежныя крылы і выпусціла вострыя кіпцюры. Крывавыя падзеі ў Грузіі выразна паказалі, што цяперашняе крамлёўскае кіраўніцтва не спыніцца ні перад якімі міжнароднымі пагадненнямі, нормамі чалавечнасці і заканадаўства, што для гэтай палітычнай банды ўчарашніх спецслужбоўцаў, а сёння ўладароў амаль адной шостай часткі зямлі, няма аніякіх маральных абмежаванняў. Масква проста не можа жыць і існаваць без вайны. Вайна — халодная і ксенафобная ці збройная і крывавая — гэта яе сутнасць, яе светагляд, яе асноўная палітыка.

Адразу пасля драматычных падзей у Грузіі і падпісання пагаднення паміж Злучанымі Штатамі Амерыкі і Польшчай пра размяшчэнне на тэрыторыі апошняй ракет супрацьпаветранай абароны, Масква ўзяла ў абарот Аляксандра Лукашэнку і, як кажуць, прыціснула яго да плота. Паводле дыктату Крамля ўрад Беларусі мусіць неўзабаве падпісваць дамову з Расіяй пра агульную сістэму супрацьпаветранай абароны. Што гэта будзе за „абарона", добра вядома з нашай гісторыі, гісторыі далёкай і нядаўняй.

Вайсковы саюз Беларусі з Расіяй — гэта непазбежная вайна для беларусаў. І не так істотна, дзе будуць ваяваць і гінуць беларускія хлопцы за крамлёўскія імперскія інтарэсы. На жаль, жорсткія ўрокі вайны ў Афганістане, дзе толькі па афіцыйных даных склалі галовы больш 700 беларусаў, яшчэ тысячы назаўсёды страцілі фізічнае і псіхічнае здароўе, забытыя альбо незразумелыя беларускім грамадствам. У сённяшняй беларускай народнай супольнасці па вялікім рахунку няма ні разумення палітычнай небяспекі з боку Масквы, ні інстынкту самазахавання. Нельга сцвярджаць, што беларусы ў бальшыні хацелі б далучэння Беларусі да Расіі, але нашы людзі ў цэлым не разумеюць, што насамрэч вырабляе крамлёўская ўлада ў дачыненні да нашай краіны. Тым больш мазгі ім капітальна прамывае і дурманіць подлая тэлевізійная прапаганда. Канешне, пагрозу дзяржаўнаму суверэнітэту добра разумеюць апазіцыйныя сілы. Менавіта на тлумачэнне знешнепалітычнай сітуацыі павінна быць скіравана праца дэмакратычных партый і незалежных кандыдатаў на бягучых так званых „парламенцкіх выбарах".

Цудоўна разумее небяспеку новага аншлюсу і ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі ў эміграцыі. Нездарма яго старшыня Івонка Сурвіла, гэтая вельмі інтэлігентная і палітычна мудрая жанчына, звярнулася з досыць эмацыйным, але выключна трапным, адкрытым лістом да беларускага народа. У сваім звароце яна скіроўвае ўвагу на тое, што беларуская дзяржава ў вялікай небяспецы. Спадарыня Сурвіла слушна папярэджвае, што „заключэнне псеўдаабароннай дамовы з Расіяй станецца нашай агульнай магілай".

Пакуль беларусы не ўсвядомяць у сваёй бальшыні ўвесь жах маскоўскай пагрозы і сутнасць яе агрэсіі, нацыя будзе дрэйфаваць альбо імкліва рухацца ў бок палітычнага і нацыянальнага самагубства. Засталося не так шмат крокаў...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

А гады плывуць і плывуць...

II

Кожны этап людскога кругавароту нясе ў сабе як мілыя, так і цяжкія сюрпрызы. Падобна бывае і з цэлымі грамадствамі. Праходзяць і яны праз этапы ці перыяды — і гэтыя перыяды могуць у іх быць лепшыя ці горшыя.

Возьмем, напрыклад, нашу тутэйшую нераспешчаную добрым жыццём беларускую меншасць — прыглянься яе зменлівым паваенным лёсам. Пройдзена ўжо намі немалая дарога — звышшасцідзесяцігадовая. Пара аглянуцца назад і паразважаць над нашай дарожнай картай.

Пасляваенны час усіх народаў і тэрыторый, праз якія перакацілася такая страшная вайна, быў вельмі нялёгкім. Тым больш час нашых тэрыторый, якія і да вайны былі адсталымі, занядбанымі, запушчанымі. Да гэтай адсталасці прычыніліся і бежанства, і санацыйная Польшча, і кароткае тут савецкае панаванне, і нямецкая акупацыя. Былі яшчэ і іншыя складанасці.

Доўга не было вядома, да якой дзяржавы будзе належаць наша тэрыторыя — да Савецкага Саюза ці Польшчы. А калі да Польшчы, то якой мае быць гэтая Польшча? Ані санацыйная Польшча, ані Савецкі Саюз не пахлі нашаму народу. Добра ўпіліся яны нам у косці ў свой час і добра было вядома чаго можна чакаць ад іх.

З цягам часу пачало праясняцца, што наша тэрыторыя будзе належаць да Польшчы, а польскае грамадства пачне будаваць новую, іншую Польшчу — народную, справядлівую.

Моцна абяцаючымі, але і цяжкімі і небяспечнымі нашаму беларускаму народу былі яе пачаткі: рэпатрыяцыя ў СССР, высокія падаткі сялянам, раскулачванне сялян, прывід калектывізацыі... А таксама польскае падполле, якое проста здзекавалася над праваслаўным беларускім народам. Загінула тады мноства нявінных ахвяр. А прывід калектывізацыі хутка стаў горкай рэальнасцю.

Я добра памятаю цяжкую атмасферу, якая навісла над тымі вёскамі, у якіх арганізавалі калгасы. Чарадою адзін за адным пёрлі туды агітатары, якія доўгімі вечарамі і начамі планамерна апрацоўвалі сялянскі калектыў оптам і кожнага паасобку. А найбольш тых, на каго — як кажуць — мелі „гака". Яны дасканала ведалі колькі ты яшчэ вінаваты дзяржаве, дзе твае дзеткі і не скрывалі, што можа стацца з табой і імі, калі не ўступіш у калгас. Так што многія проста не вытрымоўвалі такой атмасферы. Гэта было цяжкае выпрабаванне нашаму народу і трэба толькі паспачуваць яму.

Трэба тут сказаць, што і калектывізацыя, і іншыя рэпрэсіўныя формы націску ўлады найбольш шырока і востра праводзіліся ў нас, сярод беларускага насельніцтва. Не без віны тут, канешне, і нашы людзі. Адным словам, часам вельмі нялёгка жылося тады, але што быў гэта страчаны час — як некаторыя хочуць даказаць цяпер — ніяк згадзіцца не магу і каменем у Народную Польшчу не кіну. Праўда, і ў эканамічным, і палітычным, і нацыянальным плане быў гэта складаны і нялёгкі час. Але для нас, беларусаў Беласточчыны, ці ж быў ён калі-небудзь лёгкім?!

У Народнай Польшчы, на жаль, нямала было меншых і большых дурнот. Але было таксама нямала і добрых, разумных развязак і змен, напрыклад, ліквідацыя цераспалосіцы, дрэнаж, кантрактацыя. Пабудова мноства новых школ, бальніц, дарог, крамаў, клубаў. Бясплатная адукацыя і ліквідацыя непісьменнасці. Медыцынская хуткая дапамога і ўвогуле медыцынская апека, якая зліквідавала мноства страшных хвароб, напрыклад, сухоты. Вельмі танныя крэдыты і ўстанаўленне пенсій сялянам. Уводзіліся новыя пароды дамашняй жывёлы, фруктовых дрэў, гародніны, збожжавых культур. Пачалі заворваць сенажаці і засяваць іх новымі, выдатнымі культурамі траў і г.д.

Хоць не надта цаніліся тады навука і вучоныя людзі, але была велізарная мода на навуку. Хто меў сякую-такую галаву на плячах, ахвоту і вытрымку, мог здабыць адукацыю і амаль любую прафесію, бо дзяржаўная палітыка спрыяла і дапамагала такім.

Да масавага бегу ў навуку сялянскай моладзі моцна прычынілася таксама і калектывізацыя вёскі. Калі толькі пачулі яны, што на іх долю выпала шчасце жыць ужо ў калектыўнай вёсцы, дык кінуліся ўцякаць ад гэтага шчасця, што толькі пыл курэў. Дзесьці недалёка пераду пёр задыханы і я...

Бадай адзінай сур'ёзнай перашкодай у бегу ў навуку магла быць нядобранадзейнасць кандыдата. А такую мянушку вельмі лёгка было тады прышпіліць нават чэснаму і перспектыўнаму чалавеку.

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Памяць, якая знікае

Мінула 65 гадавіна выбуху паўстання ў беластоцкім гета. Гітлераўцы стварылі яго ў 1941 г. і сагналі сюды каля 50 тысяч асоб. Распаложана было яно ў межых вуліц Ліпавай, Рынак Касцюшкі, Сянкевіча і Палескай. У рамках сёлетняга святкавання гадавіны паўстання, па волі радных Беластока і кіраўнікоў Гарадской управы, пляцу, на якім стаіць помнік паўстанцам па вуліцы Жабяй, прысвоена імя паўстанцкага камандзіра Мардэхая Тэненбаўма, сацыяліста, які ў той час быў сюды перакінуты з Варшавы. Сёлета не прыехала ў Беласток шмат яўрэяў з замежжа. Была затое пражываючая ў Ізраілі Ева Крацоўская, апошняя з жывучых удзельнікаў паўстання. Мала хто ведае аб тым, што яна з'яўляецца дачкой афіцэра Войска Польскага, які быў вывезены ў Катынь. Расказвае з хваляваннем:

— Мы ведалі, што маем быць сасланы ў лагер у Трэблінцы. Значыць, калі мелі б мы загінуць, дык з ружжом у руках, якраз у паўстанні. Вядома, непараўнальна большыя былі нямецкія сілы, якім да таго дапамагалі ўкраінцы.

Калі я слухаў расказ пані Крацоўскай, прыгадаліся мне ўспаміны Алены Анішэўскай, надрукаваныя пяць гадоў таму ў кнізе „Пакаленне вайны", выдадзенай Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва". Пісала яна м.інш.: „У назначаны дзень, яшчэ задоўга да світання, на 7 гадзіну раніцы трэба было быць пад брамай Werk № 2 па вул. Юравецкай. Сабраліся пры ёй усе накіраваныя. Мы арыентаваліся, што будзем працаваць у гета за калючым дротам з яўрэйскімі ткачамі. Пачаліся сумненні: ці не зачыняць тут нас, ці выпусцяць? Пры браме круціліся немцы з сабакамі, перакладчыкі, якія тлумачылі нам указанні немцаў. Пазабіралі ад нас паперы з арбайтсамта, выклікалі па прозвішчы і накіроўвалі да майстроў у розныя цэхі. Мы з мамай папалі ў ткальню. Старшымі цэхаў былі палякі. Але пры ткацкіх станках стаялі амаль выключна яўрэі".

У кантэксце гэтых успамінаў Еву Крацоўскую і Феліцыю Новак, пісьменніцу і журналістку, пражываючую ў Капенгагене, якая перажыла вайну, дзякуючы дапамозе польскай сям'і з падбеластоцкай вёскі Панікла, прабаваў я распытаць аб пазіцыю беластачан беларускай нацыянальнасці ў час нямецкай акупацыі ў адносінах да яўрэяў. Абедзве жанчыны, у той час падлеткі, адказалі: „Не памятаю".

Не ўдалося мне дайсці да ўспамінаў саміх яўрэяў у цікавячым мяне ваенным матыве. Сустрэў я затое пад помнікам па вуліцы Жабяй тройку старэйшых людзей, жыхароў блізкіх блокаў. Пані Ева, родам з вёскі Пянькі, што паміж Міхаловам і Гарадком, сказала:

— Мы сюды прыйшлі, бо трэба даць ушанаванне. У той час, калі мардавалі яўрэяў, мне было шэсць гадоў. Мала памятаю з таго часу. Прыгадваецца мне толькі, што туды да нас, пад Міхалова, прыязджалі яўрэі і літавалі гаршкі. Багацейшыя яўрэі мелі ў ваколіцы фабрыкі. Пад Міхаловам мы не ведалі, што тут дзеецца.

Перад урачыстасцю пры Жабяй прэзідэнт Беластока Тадэвуш Трускаляскі, пасол Ізраіля ў Польшчы Давід Пелег і прадстаўнікі мундзірных службаў усклалі кветкі да помніка па вуліцы Суражскай, прысвечанага тысячам яўрэяў спаленых жыўцом ў стаяўшай тут да вайны сінагозе. Перад блокам ля помніка хтосьці сушыў на шнурках пасцель, амаль у сутычку з лунаючымі ў траўры сцягамі Польшчы, Ізраіля і Беластока. І падумалася мне: ці гэта таксама пытанне толькі забыцця?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Сакі — другая Грабарка

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Святкаванні Праабражэння Гасподняга на горцы побач Сакоў (Кляшчэлеўская гміна), дзе знаходзіцца Дзмітрыеўская царква, адбываліся здавён-даўна, так што мясцовыя жыхары не патрапяць расказаць пра іх вытокі. Можа нейкае няшчасце, а можа ўдзячнасць Богу за яго міласэрнасць, якую хацелі аказаць мясцовыя людзі, спрычыніліся да пастаяннага ўзвелічэння Госпада ў дзень Яго праабражэння перад выбранымі вучнямі менавіта побач Сакоў. Аднак найбольш праўдападобна, што само распалажэнне царквы на горцы, якая нагадвала новазапаветны Фавор, стала прыцягваць да гэтага месца не толькі мясцовых вернікаў, але і паломнікаў. Тут жа знаходзіцца цудатворная ікона Дзмітрыя Салунскага, за якога заступніцтвам людзі атрымліваюць Божую падтрымку. Адзін з маіх суразмоўцаў успамінаў, што яго продкі прыязджалі або ішлі пяшком сюды памаліцца аж з Гарадоцкай зямлі.

Не канкурэнцыя, а дапаўненне

Пасля вайны, у час атэізацыі і будовы сацыялізму, улады намагаліся абмежаваць масавыя праваслаўныя святкаванні. Магчыма, што гэта і паўплывала на змяншэнне ўдзелу праваслаўнага насельніцтва ў святкаваннях у Дзмітрыеўскай царкве, якая доўгі час была толькі філіяльным храмам. Вельмі дастойна праходзілі святкаванні Праабражэння Гасподняга на Дзмітрыеўскай горцы і да стварэння Мужчынскага манастыра ў Саках у 2001 годзе, але нельга было гаварыць аб масавым характары гэтай малітоўнай сустрэчы. Аднак, калі ўзнік манастыр, а перад іконай святога велікамучаніка Дзмітрыя іераманахі сталі раз у месяц служыць акафіст, паток паломнікаў стаў усё большаць і большаць. Сёлета 19 жніўня запоўнілі яны невялікую Дзмітрыеўскую царкву і асабліва вялікую тэрыторыю вакол яе, хаваючыся ў цяні высокіх сосен, якія з трох бакоў акружаюць храм. Прыток паломнікаў заўважылі царкоўныя ўлады і сёлета на свята Праабражэння Гасподняга літургію ў саслужэнні мясцовых і замежных святароў з Беларусі ўзначаліў сямятыцкі епіскап Георгій. Раней усе епіскапы ў гэты дзень маліліся на Святой Гары Грабарцы. Нельга лічыць, што сакоўскія святкаванні сапраўдяюць канкурэнцыю ўрачыстасцям на Грабарцы; наадварот — адны і другія святкаванні дапаўняюцца ўзаемна і даюць такую самую радасць вернікам. У гэтым годзе сакаўскія святкаванні з удзелам епіскапа Георгія былі вельмі дастойнымі і паказалі, што можна ладзіць пешаходныя паломніцтвы не толькі на Грабарку, але і ў Сакі, дзе супольная малітва можа ўчыняць цуды. Пра цуды, якія ў мінулым атрымалі паломнікі ў Дзмітрыеўскай царкве, распавядае кніжка „Культ святога мучаніка Дзмітрыя Салунскага на Падляшшы", якая ўзнікла на падставе магістэрскай працы Міраславы Грыгарук і якая прадавалася ў час святкаванняў.

— Мы тут сапраўдяем другую Грабарку. Гэтае месца падобнае на грабарскую гару не толькі выглядам, але перад усім малітоўным настроем, які мы тут ствараем. Нездарма гэтае месца называецца святым. Калі мы ўспомнім святкаванні ў гонар велікамучаніка Дзмітрыя і маем на ўвазе сённяшнія святкаванні, якія збіраюць такую вялікую колькасць людзей, дык падыходзіць да іх народная прымаўка: „Да пустога калодзежа па ваду не ходзяць". На гэтым месцы адчуваецца боская ласка Праабразіўшагася Госпада, якая сыходзіць на вернікаў па малітвах велікамучаніка Дзмітрыя Салунскага, які праслаўляецца дзякуючы захаванай тут цудатворнай іконе. Святкаванні Праабражэння Гасподняга становяцца на гэтым месцы штораз больш масавамі і з-за таго, што тут можна спакойна памаліцца. Мы молімся тут, на Святой Гары Грабарцы і ў іншых месцах, але аб'ядноўвае нас малітва да аднаго Бога, — заявіў уладыка Георгій, які перадаў сабраным словы падтрымкі ад мітрапаліта Савы.

Святкаванні Праабражэння Гасподняга ўзначалілі ўладыка Георгій (злева) і архімандрыт Варсанофій

Пра малітвы іераманахаў за здароўе вернікаў, якія наведваюць манастыр і дасылаюць лісты з расказамі пра свае жыццёвыя клопаты, расказаў настаяцель Мужчынскага манастыра ў Саках архімандрыт Варсанофій. Заклікаў ён таксама маліцца за стрыманне ваенных дзеянняў там, дзе праваслаўныя жаўнеры змагаюцца з праваслаўнымі салдатамі (акурат працягваўся грузінска-расійскі канфлікт). Людзі, якія атрымалі дапамогу пасля малітваў на горцы ў Саках, вяртаюцца сюды штораз часцей. Менавіта дзякуючы ахвяраванням айчынных паломнікаў і дапамозе замежных дабрачынцаў дзейнічае Мужчынскі манастыр у Саках. Невялікі манастырскі прыход, да якога належаць жыхары Сакоў і Тапароў, не ў змозе многа дапамагчы манастыру, а трэба ж таксама апекавацца прыхадской царквой на горцы. Многа работ прыйшлося выканаць, каб былы школьны будынак прыстасаваць да патрэб манастыра. Трэба яшчэ прыстасаваць паддашак для начлежных мэт, дзе маглі б начаваць і будучыя паслушнікі, і паломнікі. Яшчэ перад святкаваннямі архімандрыт Варсанофій паінфармаваў вернікаў, што генеральнага рамонту патрабуе дах на Дзмітрыеўскай царкве, трэба мяняць і электрычную ўстаноўку ў храме. Аднаўлення патрабуе таксама царква ўсярэдзіне.

Дапамога залешанскіх манашак

— Нашы прыхаджане старэюцца з году ў год і ім штораз цяжэй рыхтавацца да святкаванняў, але з дапамогай прыходзяць сёстры з Манаскага дома ў Залешанах, — сказаў архімандрыт Варсанофій і падзякаваў ігуменні Елізавеце за вельмі ўдалае кіраванне манастырска-прыхадскім хорам у час святкаванняў, які ўспамаглі харысты з навакольных прыходаў. Архімандрыт падзякаваў таксама прыхаджанам за вялікую ахвярнасць у час падрыхтовачных прац і самога святкавання. Пры канцы багаслужбы ўладыка Георгій, а пасля і свяшчэннікі пасвяцілі яблыкі і іншыя фрукты.

Насельніцы Жаночага манаскага дома ў Залешанах пастаянна прымаюць удзел у багаслужбах у Дзмітрыеўскай царкве, а матушка Елізавета кіруе царкоўным хорам, у якім, апрача прыхаджан, спяваюць паслушніца Анна і дзяўчаты, якія прыязджаюць у жаночы манастырскі дом і, жывучы там, разважаюць ці не пайсці манаскай дарогай. Сямятыцкі епіскап Георгій павіншаваў ігуменню Елізавету і астатніх манашак з гадавінай манаскай дзейнасці. Якраз 24 жніўня мінуў год з часу заснавання Жаночага манастырскага дому ў Залешанах пад апекай св. велікамучаніцы Кацярыны. У апошнюю нядзелю ў хатняй манастырскай царкве ў Залешанах была адслужана літургія з удзячнымі малітвамі.

— Актуальнымі застаюцца ранейшыя нашы планы. Ужо падрыхтаваная канцэпцыя будовы асобнай царквы побач манастырскага дома, але яшчэ не ведаем, ці рашымся на драўляную будоўлю, паколькі танней будзе нам збудаваць мураваны храм. У бліжэйшы час будзем абгароджваць манастырскую тэрыторыю, покі, з-за нястачы сродкаў, толькі сеткай. Ужо да зімы не паспеем ацяпліць нашага дома, а ў больш далёкай перспектыве прадбачваем дабудаваць да манастырскага жыллёвага дома гаспадарчыя памяшканні і майстэрню, — спецыяльна для „Нівы" заявіла ігумення Елізавета. — Яшчэ год будзе прадаўжацца ў мяне стажыроўка ў Грэцыі, дзе я рыхтуюся да абароны доктарскай дысертацыі. Я адной нагой тут, а другой у Салоніках і зараз мне апрача турбот за манастыр трэба займацца вучобай і навуковай работай. Стыпендыі з Грэцыі хапае на дарогу і жыццё ў гэтай краіне, а сродкі на манастыр збіраем мы на месцы. Многа дапамагаюць нам жыхары Залешанаў і навакольных сёл. Аднак калі гаварыць пра фізічную работу ў манастыры, дык ёсць прыхільнікі нашага манастыра з Бельска, Гайнаўкі ці Беластока, якія прыязджаюць на нашы заклікі і дапамагаюць нам у неабходных працах.

Ад апошняй маёй размовы з ігуменняй Елізаветай у кастрычніку мінулага года многа памянялася ўсярэдзіне манастырскага дома. Зараз прыгожа абсталяваная дамовая царква, у якой моляцца матушкі і іх госці ў час ранніх і вячэрніх малітваў. Працягваўся таксама рамонт начлежных пакояў. Прыгожа абсталяваная манастырская прыёмная. Калі матушка ігумення часта ў раз'ездах, цяжка сабраць сродкі для жыцця, не гаворачы ўжо аб рамонтных работах.

PS. Ахвяраванні на рамонт Дзмітрыеўскай царквы ў Саках можна пералічваць на банкаўскі рахунак **PKO SA o/Hajnówka, nr konta 47106000760000401170080203**. Жадаючыя ўспамагчы Жаночы манастырскі дом у Залешанах могуць пералічваць ахвяраванні на рахунак **Bank Spółdzielczy w Brańsku, nr konta 18806300010070070659180001**.

Гайнаўка

Вандалы ў горадзе

Ізноў збілі рог аднаму з трох зуброў-помнікаў, якіх у мінулым годзе паставілі ў Гайнаўцы ля скрыжавання вуліц Баторыя, Спартыўнай і а. Дзевятоўскага (тут кругавы рух). Іх моцна падсветлілі ноччу. Але гэта, як відаць, нічога не дало. Сярэдні зубр стаў калекам.

Хуліганнё выпаліла дзіркі ў прыгожых дашках з далікатнымі сценкамі з плексігласу на прыпнках аўтобусаў гарадской камунікацыі па вул. Баторыя ля скрыжавання вуліц 11 Лістапада і кс. Верабея. Лавачкі пад гэтымі дашкамі ўпадабала сабе моладзь. Яна збіраецца вечарамі і курыць. А зараз без дай прычыны папяросамі і запалкамі юнакі выпалілі дзіркі ў сценах. Тут і зацёртыя расклады язды аўтобусаў. І падумаць толькі, гэтак дзеецца ў цэнтры горада!

І яшчэ. Вандалы выбілі сцены пад дашком насупраць рэстарана „Леснічанка" па вул. 3 Мая.

На гайнаўскім вакзале ПКС ёсць тры дашкі з лавачкамі для пасажыраў. У двух з іх хуліганы выбілі бакавыя сценкі з тоўстага шкла. Глядзіш на гэта і рукі апускаюцца!

16 жніўня г.г. я хадзіў па гайнаўскіх вуліцах ад гадзіны 12 да 15.30 і не бачыў ні аднаго паліцыянта. Абедалі?

Гайнаўка прыгажэе!

Сёлета ў канцы ліпеня ў Гайнаўцы закончылі пабудову прыгожай маставой м.інш. па вуліцы Паркавай, а побач яе тратуараў і аўтастаянкі з брусчаткі.

Вясною найперш пачалі пракладку новых тратуараў на скрыжаванні вуліц Арміі Краёвай з Белавежскай. Пасля — на адным баку вул. Белавежскай і на скрыжаванні вуліц Белавежскай з Паркавай.

Апрача гэтага ў ліпені клалі брусчатку на дарожках паміж шматсямейнымі будынкамі ў цэнтральным пасёлку „Міленіум". Ішоў я сюдою 14 жніўня г.г. і аж дзіву даўся! Як жа тут прыгожа і бяспечна на гэтай гарадской міжблокавай тэрыторыі!

(ян)

Навіны з Чаромхі

Новы тратуар

Некалькі год таму гміна пачала будову веласіпеднай сцежкі з вёскі Чаромхі ў аднайменны пасёлак і мадэрнізацыю тратуара на вуліцы 1 Мая. Работы праводзіліся этапамі, паколькі ў гміннай касе не хапала грошай. З дапамогай у заканчэнні інвестыцыі прыйшло Павятовае староства ў Гайнаўцы. Паводле дамовы з самаўрадам Чаромхаўскай гміны, староства прыняло на сябе абавязкі інвестара. Гміна абавязалася ўносіць на рахунак староства 50 тыс. зл. у год. Сёлета будова тратуара закончылася. Зараз вуліца прэзентуецца шыкоўна: новы тратуар, газоны з кветкамі, акуратна прыстрыжаны ліпы і, асноўнае, чысціня ды парадак. Варта адзначыць, што вуліца 1 Мая лічыцца цэнтральнай у пасёлку і з'яўляецца візітнай картачкай чарамшан. Хацелася б, каб і апошнія вуліцы так выглядалі.

Уладзімір СІДАРУК

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

ЗНАЁМСТВА з традыцыйнай кулінарыяй

Гмінны асяродак культуры ў Орлі здаўна не мае адпаведнага памяшкання для сваёй статутнай дзейнасці. Цяперашні офіс вельмі цесны, няма тут сцэны, немагчыма правесці ў ім сход, не згадваючы ўжо нават пра выстаўкі ці канцэрты. Аднак, як нядаўна аказалася, вельмі цікавыя і карысныя заняткі з моладдзю можна правесці і навонкі яго. Здзейсніла гэта дырэктар асяродка Анна Несцярук, а мерапрыемства можа быць вельмі перспектыўным.

Арлянскі ГАК звярнуўся ў Ваяводскую ўправу за дафінансаваннем праекта „Warsztaty Kulinarne — Smak Tradycji". Хадайнічалі за амаль пяцсот тысячамі злотаў, атрымалі чатыры тысячы. Гэтыя сродкі будуць прызначаны на куплю трох драўляных латкоў, крытых гонтай, дзеля прэзентацыі ежы; у плане выпуск кнігі кулінарных рэцэптаў (на польскай і беларускай мовах). Найперш былі куплены неабходныя для кулінарнай вытворчасці прадукты, з якіх пад вокам спрактыкаваных старэйшых гаспадынь моладзь выпякае гатовыя прысмакі. Праграма запушчана ў ход 14 ліпеня, а завяршэнне майстар-класаў будзе ў канцы жніўня. ГАК фінансуе каля 75% мерапрыемства, гміна гарантуе транспарт.

— Ідэя кулінарных майстар-класаў, — кажа дырэктар ГАК Анна Несцярук, — выспела з патрэбы прэзентацыі і прыпаміну нашых мясцовых прысмакаў, простых і смачных страў, якія калісь рыхтавалі нашы бабулі. Паралельнай мэтай нашай ініцыятывы стала фінальная для праекта прэзентацыя ежы і смакаванне яе пры нагодзе кірмашу 31 жніўня г.г. у час „Арлянскіх сустрэч", спалучаных са святкаваннямі 85-годдзя арлянскай пажарнай каманды. Дагэтуль на фэстах не было кулінарных стэндаў.

— А як праходзяць майстар-класы: ці цяперашняя моладзь ахвотна займаецца колішняй кулінарнай справай?

— Калі мы даведаліся пра дафінансаванне, згадзілі мы чатыры ахвотныя гаспадыні. Па вёсках, напрыклад, у Крывятычах ці Рудутах, некаторыя жанчыны яшчэ выпякаюць свой хлеб, а ў Маліннiках адна гаспадыня пячэ яшчэ каравай — так як калісь — з галінкамі і гускамі. Каравай рыхтавалі на вяселлі, а сабе людзі пяклі булкі, такія як мы на майстар-класах — з сырам, карыцай (цынамонам), буславы лапы...

Пачалі збіраць моладзь. Я думала, што не будзе ахвотных хлопцаў, але — надзіва — сабралася іх шмат. Дзеці рознага ўзросту, ад падставоўкі па ліцэй. Сабралася байкаватая група: Гося Мартыновіч, Марта Бало, Марыёля Кубаеўская, Ева Банькоўская, Оля Шайкоўская, Матэвуш Назарэвіч, Андрэй Банькоўскі, Барташ Гарадэцкі, Паўля Кубаеўская, Каміль Паўлючук, Наталля Міранчук, Дарыюш Савіцкі.

Заняткі адбыліся ў аўторак, 21 ліпеня, у Рудутах. Спадарыня Зоя Майстровіч паказала, як калісь рабілі галушкі з мясам ды абаранкі з сырам смажаныя на аліве. Хлопцы рыхтавалі галушкі, а дзяўчаты абаранкі і ўсе працэдуры прайшлі вельмі ўдала. Найбольш часу патрацілі на галушкі, бо ж вараную бульбу трэба было змалоць у мясарубцы, а сырую падзерці.

На другіх занятках Надзея Сахарчук з Маліннік паказала як выпякаць колішнія булкі. Гэтыя заняткі адбыліся ў Крывятычах, у Вольгі Несцярук, бо ў яе ёсць адпаведная печ, у якой сама гаспадыня яшчэ выпякае хлеб. Заняткі доўжыліся шэсць гадзін, бо ж час патрэбны і для рыхлення цеста, і для нагрэву печы.

— Хто працаваў больш: гаспадыня ці моладзь?

— Я стараюся арганізаваць заняткі так, каб усё рабіла моладзь, а дарослыя як найменш умешваліся ў працу. Некаторыя дзеці заўважалі, што так рабілі іхнія бабулі. Моладзь працавала з зацікаўленнем, бо цікава было пакаштаваць вынікі сваёй працы.

— Ці ў час заняткаў спявалі нейкія песні?

— Ой, так! Спадарыня Сахарчук падспеўвала: „Печ рахоча, хахоча, булачок хоча...", спявалі каравайныя песні. Былі і вершы, а моладзь толькі вушы настаўляла. Але спачатку спадарыня Надзея загадала дзяўчатам звязаць валасы, каб дысцыпліна была. Узніклі вельмі цікавыя размовы між пакаленнямі, такі абмен вопытам. Падводзячы — заняткі прайшлі ў вельмі сімпатычнай атмасферы. Аднак найбольш складанае перад намі — пячэнне хлеба, калі трэба будзе мясіць. Цікава, як з гэтым справіцца моладзь, бо каб атрымаць добры хлеб, то яго трэба мясіць гадзіну або і больш. Плануем таксама паказаць выраб свойскай каўбасы і яе вэнджанне. Гэтыя супольныя вырабы хочам паказаць на нашым фэсце. А такога яшчэ ў Орлі не бывала.

Супрацоўніцтва гарадоў-партнёраў

Моладзь з Седльцаў у Ваўкавыску

У рамках абмену паміж гарадамі-партнёрамі сядлецкая моладзь з 14 па 16 жніўня пабывала ў Ваўкавыску Гродзенскай вобласці. З польскага боку патранат над абменам узялі самаўрадавыя ўлады. Як патлумачыў намеснік старшыні Рады горада Седльцы д-р Адам Бобрык, маладзёжны абмен — важны элемент міжнароднага супрацоўніцтва, дзякуючы якому кантакты становяцца непасрэднымі і даюць вымерныя карысці. „Моладзь мае нагоду бліжэй пазнаёміцца з культурай і традыцыяй іншых краін, на практыцы навучыцца іншым мовам, а таксама завязаць знаёмствы, якія могуць быць прыгоднымі ў будучай прафесійнай працы", — дадаў Адам Бобрык. Апекуном групы падчас паездкі быў дырэктар I Агульнаадукацыйнага ліцэя Анджэй Копец. Астатнія ўдзельнікі гэта: Магдалена Альгавам, Марыюш Чапля, Катажына Фрончак, Катажына Гантарчык, Мая Камінска, Якуб Пнеўскі, Эдыта Пастар, Ольга Вэрбова.

У Ваўкавыску сядлецкіх гасцей прывіталі з вялікім энтузіязмам і ангажаванасцю

У Ваўкавыску сядлецкіх гасцей прывіталі з вялікім энтузіязмам і ангажаванасцю. Перш за ўсё гэта заслуга старшыні Ваўкавыскага райвыканкама Дзмітрыя Гольца і яго намесніка Ігара Кашкевіча. Нашай моладзі была аказана магчымасць усебакова пазнаёміцца з багатай гісторыяй горада, якая налічвае ўжо больш за тысячу гадоў. Яны наведалі не толькі музей, помнікі архітэкуры, касцёлы, але пабывалі таксама ва ўстановах, звязаных з сучаснай сацыяльнай структарй горада. Удзельнікі абмену згодна сцвярджаюць, што яны пераканаліся ў тым, што Ваўкавыскі раён з яго традыцыяй і насельніцтвам з'яўляецца важным элементам не толькі беларускай, але і польскай культурнай спадчыны. Сёння палякі складаюць траціну насельніцтва ўсяго раёна, а ў горадзе працуе адна з дзвюх польскіх школ у Беларусі.

Праграма пабыўкі распрацаваная была вельмі дэталёва, а апекунамі моладзі былі перш за ўсё іх беларускія равеснікі. Эдыта Пастар сказала: „Група моладзі з дружалюбнага Ваўкавыска спадарожнічала нам падчас усёй пабыўкі і ўжо ў першы дзень стала нам незаменным таварышам гульняў і заўсёды аказвала дапамогу. Дзякуючы сувенірам, якімі адобрыў нас горад Ваўкавыск, мы не згубім з памяці і вачэй мілых нашым сэрцам месцаў і людзей".

Паводле Якуба Пнеўскага, другі дзень пабыўкі, 15 жніўня, яе ўдзельнікі будуць успамінаць як цудоўную спартыўную прыгоду, поўную добрых эмоцый і ўсмешак. Гаспадары аказаліся перфекцыяністамі, а сядлецкая каманда заняла II месца. Найлепшых вынікаў госці дабіліся ў працягванні каната і кідках калодай. Пасля спартыўных спаборніцтваў самым лепшым лякарствам для пераатомленых мышцаў аказалася г.зв. „баня" — традыцыйная беларуская саўна. „Арганізатары спартыўнага лагера праявілі вялікую ініцыятыву, што было бачна па запланаваных забавах, у якіх мы ахвотна ўдзельнічалі", — адзначаюць маладыя жыхары Седльцаў.

Сядлецкая моладзь з настальгіяй пакідала гасцінны і чароўны горад Ваўкавыск, у якім, як сказала Эдыта Пастар, „беларуская кухня заваявала паднябенні". А Марыюш Чапля ў сваю чаргу дадаў, што „пасля гэтага радаснага часу, праведзенага з беларускімі, рускімі і канадскімі сябрамі, застаецца ў нас усмешка на тварах і вера ў тое, што яшчэ калісьці туды вернемся". Маладзёжны лагер гарадоў-партнёраў напэўна быў цікавай ініцыятывай. Цешыць нас тое, што супрацоўніцтва з Беларуссю апісвае штораз шырэйшыя кругі і становіцца штораз больш непасрэдным.

(аб)

Дні Кляшчэляў

Традыцыйныя Дні Кляшчэляў сёлета адзначаліся ўжо дванаццаты раз і праходзілі 26-27 ліпеня. Гэтая цыклічная імпрэза настала запісалася ў каляндар культурных мерапрыемстваў горада. Штогадовая двухдзённая імпрэза пачалася ў суботу турнірам пляжнага валейбола. Удзельнічалі чатыры каманды. Пераможцам стала каманда з Гайнаўкі (Марыюш Гайка і Марк Туроўскі). Атракцыёнам сёлетніх святкаванняў было адкрыццё „Гладышкі" — гарадскога цэнтра турызму і культуры. Мерапрыемства пачалося з канцэрта мясцовых гуртоў „Mikstura" і „Fantazja", затым выступіла вакалістка, якая запрэзентавала гіты групы „Maanam". Традыцыйнае разрэзанне стужкі і адкрыццё „Гладышкі" здзейснілі бурмістр горада Аляксандр Сяліцкі, рэктар Беластоцкага політэхнічнага інстытута Іанікій Назарка і старшыня Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі і заадно прарэктар БПІ Васіль Крупіч. На адкрыцці прысутнічалі жыхары горада, члены Таварыства і шматлікія госці, якія прабываюць у Кляшчэлях на адпачынку. У новаадкрытым культурным цэнтры можна было паглядзець выстаўкі: мінералаў (Мікалая Падлашчыка), жывапісу (Барбары Александровіч), разьбы па дрэве (Славаміра Смыка) і пажарніцкіх хронік Падляшскага ваяводства. Гэтая апошняя працавала з 26 па 31 ліпеня.

„Катрынка" на сцэне

У нядзелю (27 ліпеня) на стадыёне а 11-й гадзіне пачаліся заняткі па стральбе з лука, затым у 15 гадзін быў разыграны турнір па гэтым відзе спорту ў двух катэгорыях: малодшай (да 18 год) і дарослай. У катэгорыі дарослых удзельнічала дзевяць асоб (у гэтым ліку адна жанчына). Перамог Лешак Алясюк, II месца — Андрэй Кочук і III — Марцін Янушкевіч; у малодшай катэгорыі ўдзельнічала адзінаццаць дзетак: I месца — Лукаш Пароўскі, II — Каміль Шыманюк і III — Крыстына Свідэрская. Спецыяльную ўзнагароду атрымала адзіная ўдзельніца турніру жаночага полу Ала Леанкевіч з Кляшчэляў. Спонсарам турніру выступіла страхавая фірма, а яго ініцыятарам — ураджэнец Кляшчэляў Міхал Санчанка, які цяпер пражывае ў Беластоку. Забаўляльная праграма для дзетак „Гуляй разам з намі" і мастацкая частка для дарослых пачалася ў 14 гадзін канцэртам „Бяседа польская". Пасля выступілі мясцовыя гурты „Mixtura" і „Fantazja", калектыў „Катрынка" з Высокага (Беларусь) і „Dwie Korony". Зоркай вечара быў гурт „Hellada". Мастацкая частка завяршылася дэманстрацыяй феерверкаў і танцамі. Іграў музычны гурт „Deja vu".

(ус)

Адкрыццё „Гладышкі"

Фота з архіва Кляшчэлеўскага ГОКа

Урачыстасць і будні ў Трасцянцы

2 жніўня, на Ілью, у Трасцянцы, што ў Нарваўскай гміне, адбывалася незвычайная ўрачыстасць. Побач царквы сабралася многа народу як на ўмовы пастарэўшай вёскі і ўсе чакалі прыезду епіскапа сямятыцкага Георгія — дырэктара Праваслаўнага асяродка міласэрнасці Варшаўска-Бельскай епархіі. І калі ўжо епіскап прыбыў у вёску, вернікі спаткалі яго з харугвамі і спевамі ды павялі ў мясцовы Дом апекі для састарэлых, што месціцца ў колішняй школе. Епіскап Георгій заклаў там краевугольны камень пад разбудову згаданага дому.

Урачыстасць адбылася з удзелам мясцовага настаяцеля а. Юрыя Ахрымюка, нарваўскага дэкана а. Васілія Рошчанкі, кляшчэлеўскага дэкана а. Мікалая Келбашэўскага і двух святароў з Ласінкі а. Георгія Коса і а. Аляксея Куліка. На ўрачыстасці быў прысутны войт Нарваўскай гміны Якуб Садоўскі з жонкай. Самае ўмураванне адбылося спешна, таму што стала грымець і пайшоў дождж. Усе папрыкрываліся парасонамі. А пасля самога акта ўмуроўкі епіскап ужо ў доме апекі, на калідоры, сказаў некалькі цёплых слоў.

Школу ў Трасцянцы, што стаяла побач царквы, пабудаваную ў 1959 годзе, калі не стала дзяцей, гміна перадала мясцовай парафіі пад дом апекі. Гэта было ў верасні 2000 года. Пасля гадавой адаптацыі 2 верасня 2001 года быў урачыста адкрыты Праваслаўны дом апекі для састарэлых. Ва ўрачыстасці прымаў удзел мітрапаліт варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава. З гэтага часу Дом апекі вядуць настаяцель царквы ў Трасцянцы а. Юрый Ахрымюк з матушкай Тамарай.

Цяпер пастаянна жыве тут 27 пенсіянераў. Апякуюцца імі 4 апякункі-прыбіральшчыцы, 2 кухаркі і адна медсястра. Прыязджае і доктар з асяродка здароўя з Нарвы. За год памірае тут да пяці чалавек. З тых першых пенсіянераў, што прыбылі яшчэ ў 2001 годзе, жывуць дзве бабулькі — Ліда з падзаблудаўскіх Астравок і Юля з падбельскіх Пілікаў.

Дом апекі ўтрымліваецца на грошы пражываючых тут пенсіянераў. 75 працэнтаў іхняй пенсіі ідзе на ўтрыманне, рэшта астаецца ўласнікам. Гэтых грошай мала, бо і на лякарствы шмат ідзе. Таму бацюшка шукае дапамогі дзе зможа. Многа дапамагае Цэнтр міласэрнасці „Элеас" — дае на харчы і на дробныя рамонты. А на разбудову асяродка атрымалі сродкі з дэпартамента веравызнанняў і нацыянальных меншасцей Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. Харчамі дапамагае таксама Малочнае прадпрыемства з Гайнаўкі — дастаўляе малочныя вырабы. Керамічнае прадпрыемства з Ляўкова за паўцаны прадало цэглу на разбудову Дома. Гэта значная падмога!

Настаяцель а. Юрый просіць усіх, хто ў змозе дапамагчы. Грошы можна пералічваць на банкаўскі рахунак:

Bank Spółdzielczy w Narwi, 85808600040000101020000010.

Бацюшка Юры і матушка Тамара проста прысвячаюць сваё жыццё, усе свае сілы, каб людзі старэйшага веку, якіх не мае часу ці не хоча глядзець сям'я, мелі тут годнае жыццё.

РУТА

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Лавец і нявольнік

Скажыце, дзеці, якіх лясных звяроў вы баіцеся? Напэўна, ваўка, мядзведзя, рыся. А ёсць людзі, якія зусім не баяцца звяроў. Яны іх кормяць, адважна ўваходзяць у вальеры да зуброў, кабаноў, тарпанаў. Зімою развозяць сена і буракі па пушчы. Следам паважна ідуць велізарныя калматыя зубры і проста з воза хапаюць салодкія карані. Яздок іх не адганяе. І пакуль даедзе да апошняй кармушкі, любімага ласунку лясных волатаў амаль не застаецца,

Вы, вядома, здагадаліся, пра каго я вам расказваю, Так, гэта егеры, якія ўзімку ратуюць звяроў ад голаду, а ўлетку сочаць, каб быў у звяроў вадапой, нарыхтоўваюць сена на перыяд зімоўкі.

Вось аднаму такому егеру, якога завуць Аляксандр, і жыве ён у Перарове, дырэктар загадаў папоўніць вальер звярамі. Надыходзіла вялікае свята — 60 год, як быў заснаваны Нацыянальны парк на беларускім баку Белавежскай пушчы. З'едуцца госці, пойдуць аглядаць дзікіх жывёл у вальерах, а там — нягуста. Некаторых відаў наогул няма. Каб клеткі не пуставалі, а шматлікія госці маглі падзівіцца на багаты жывёльны свет старажытнай пушчы, малады егер атрымаў пачэснае заданне: налавіць паболей звяроў.

Лёгка загадаць — цяжка выканаць, але Аляксандр не з тых людзей, якія апускаюць рукі. Тут жа ўзяўся выконваць распараджэнне дырэктара. І ў хуткім часе наваселлі ў новых клетках спраўлялі дзве куніцы- мілавіцы, два зайцы-малайцы, два ваўкі-дзівакі, дзве лісіцы-сястрыцы, аж тры яноты-абармоты, пяць дзікоў-сябрукоў, два тхары-бахуры і дзве вавёркі-тараторкі.

Заставалася злавіць толькі аднаго рысёнка і аднаго лася.

Стаў егер блукаць па пушчы, шукаць рысяня. Бывае, што адаб'ецца малое ад маці, альбо самка сама пакіне падрастаючага сыночка. Здараецца натрапіць адразу на двух малых. Доўга ці коратка блукаў

егер па пушчы, але раптам яго чацвераногія памочнікі сталі моцна брахаць. Пабег Аляксандр на брэх сабак і ўбачыў, як тыя скачуць ля сасны, дзяруць кіпцюрамі кару, а морды ўверх задзіраюць. Зразумеў егер, што ягоныя дружбакі-сабакі загналі маладога рысёнка на дрэва. Хочаш не хочаш, а лезці за ім прыйдзецца. Выцягнуў ён пасак са штаноў, зрабіў пяцельку і палез на дрэва. Пнецца ён угору, а рысёнак яшчэ вышэй лезе. Тут бы самому ўтрымацца на гладкай сасне, а як назло нагавіцы без паска з худога жывата спаўзаюць. І ці то іх трымаць, ці рысянё лавіць. Успомніў загад дырэктара — і шпарчэй стаў карабкацца ўверх. Узабрацца то ён узабраўся на вершаліну, а вось як зняць малога драпежніка?

Рысянё, бы тая сярдзітая кошка, кіпцюрастай лапай ледзь не пакінула на ягоным твары аўтограф. Эх, дзівак, падумаў егер пра сябе. Ведаў жа, куды ішоў. Мог бы хоць мяшок які прыхапіць. Але раздумваць, седзячы на сасне, не было калі. Скінуў хуценька з плеч куртку, злаўчыўся і накрыў ёю вялікае пушыстае кацянё.

Рысянё фыркала і вырывалася з курткі. Яго востранькія кіпцюры ўпіваліся ў бок лаўца, прымушаючы таго хутчэй спускацца ўніз. Шматкі з амаль новай курткі ляцелі ва ўсе бакі, пасак трашчаў, штаны заставаліся на „чэсным слове". Нарэшце ногі апынуліся на цвёрдай зямлі. Тут ужо егер схапіў сваю знаходку ў моцныя абдымкі і, што ёсць сілы, паімчаў да вальераў, азіраючыся, ці не ляціць зверху на яго раз'юшаная рысь.

Добра, што дарога была блізкай, а куртка моцнай. Калі Аляксандр выпусціў нарэшце рысёнка ў клетку, то заўважыў, што ад новай яго вопраткі цэлымі засталіся толькі каўнер і гузікі. Пасумаваў крыху егер, што пападзе яму ад жонкі на арэхі, але хутка супакоіўся.

— Не сумуй і ты, Шустрык, — ласкава звярнуўся мужчына да малога нявольніка, і яго сэрца агарнуў жаль.

Не з-за парванага адзення, а з-за свайго ўчынку. Навошта пазбавіў дзіця свабоды? І затым супакоіў сябе: прапала б жа яно адно ў пушчы. Маці ж не аб'явілася. Сярод звяроў таксама сустракаюцца такія маці, якія кідаюць сваіх дзяцей на волю лёсу.

— Не гаруй, брат, — сказаў на развітанне яму егер.— Я цябе ў крыўду не дам.

Сапраўды, пачуццё нейкай віны перад гэтым драпежным звярком, які так ірваўся на волю, доўга не пакідала яго. Аляксандр сам даглядаў Шустрыка, размаўляў з ім. І рысёнак пазнаваў яго яшчэ далёка ад клеткі, і кожны раз радаваўся, як дзіцё, калі бачыў віноўніка свайго палону.

Таіса СКУРАТАВА
Белавежская пушча

Ці варта вучыцца?

Сёння вельмі часта сустракаемся з тым, што вучням не хочацца вучыцца. Ці гэта добра? Думаю — не. Моладзі вельмі цяжка знайсці мэту свайго жыцця. Бацькі гоняць да вучобы. Маладым гэта не падабаецца. Проста, не хочацца думаць пра будучыню. Аднак за некалькі гадоў многія з нас захочуць стаць студэнтамі. І што тады? Калі не хочацца працаваць цяпер, што будзе ў будучыні? Людзі без ведаў, з малым інтэлектуальным патэнцыялам не маюць перад сабой будучыні. На жаль, цяжка нам гэта зразумець. Вінаватая наша лянота. Думаю, што зараз у свеце цэняць толькі мудрых і працавітых людзей.

Варта вучыцца!

Агнешка САРОКАШ, Гімназія № 3 у Бельску-Падляшскім

Віктар ШВЕД

Навука — ведаў зарука

Па мілым летнім адпачынку,
Па розных закутках вандроўках,
Да ўжо адноўленых будынкаў
Вучні вярнуліся ізноўку.
Знаюць аб гэтым нашы дзеці,
Бачаць уласнымі вачыма,
Што ў сённяшнім складаным свеце
Жыць без навукі немагчыма.
Дык дзеткі нашыя, вядома,
У новым навучальным годзе,
Будуць заўсёды ў школе, дома,
Вучыцца надта пільна штодзень.
І мовы вывучаць старанна
Замежныя абавязкова,
Заўжды адносіцца з пашанай
Да беларускай роднай мовы.



Міра ЛУКША

Крук з Крукоўшчыны

Шчыры крук ля пліты.
Вось наварыць смакаты!
„Навару вам, навару!
Кру-кру-кру!
Накармлю ўсю чараду
У аўторак, сераду,
Тлушчам акрашу,
А ў пятніцу — з кашай,
Тады — пасней,
Бялей, малачней...”

А ў свята,
— Багата?
Чаго наварыш,
Чорны таварыш?
„Круп на патэльню
Насыплю жменю,
А для акрасы —
Пута кілбасы!”
Ой, нездар-р-р-ова
Ежа крукова!
„Такое бяды:
Паеж лебяды,
Бяры сыр сыры...
Маёй ежы не жары!”

Музыка з кайфам

Гіт-парад „Глюкаў”!

Гіт-парадаў па беларускай музыцы, даступных у першую чаргу падляшскім беларусам, не зашмат. Што я кажу? Увогуле іх няма! Адказаць чаму так — даволі проста. Па-першае, у Польшчы няма беларускага музычнага рынку, а і беларускіх гуртоў у нас малавата, каб спаборнічаць за папулярнасць. А шкада, бо можа ўдалося б сарганізаваць падляшскі гіт-парад, а нашы слухачы без ніякіх абмежаванняў маглі б выказваць свае сімпатыі да беларускіх выканаўцаў, якія ствараюць у розных месцах свету. Вялікую справу рабіў для нас калісьці Стэп, вядомы як дыджэй Зона падляшскі музычны журналіст, які працаваў дыджэем, калі ўпершыню ў эфіры прагучалі пазыўныя Радыё Рацыя, недзе 8 гадоў таму. Ён тады стварыў „Гіт-парад”, запісаў альбом гурту „Гоман”, а ў эфіры Радыё Рацыя правёў канцэрт гурту „RIMA”. Добра помню, як у перадачах з'яўляліся чарговыя песні з нашай музычнай гісторыі і як яны цвёрда канкуравалі з новымі гітамі гуртоў „Н.Р.М” ці „RIMA”. Гэтаму спадарожнічалі вялікія эмоцыі, неспадзяванкі, усё, што цікавае было маладым людзям. Самае важнае, што праводзілася папулярызацыя беларускай музыкі. Сёння чакаць такога можна толькі ў марах. Можа нехта з вас пацікавіцца ідэяй і наладзіць у інтэрнэце свой беларускі гіт-парад?

На сёння бесканкурэнтным з'яўляецца „Тузін гітоў”, якому няма альтэрнатывы. Якраз на „Тузіне гітоў” падводзяцца вынікі музычнага года, але цяжка там знайсці беларускія гурты з Падляшша. Наогул, калі і трапляюць яны пад галасаванне, адразу пасля тура прападаюць. Зараз толькі дзякуючы ацэнцы беларускіх экспертаў і актыўнасці сімпатыкаў праекта „Ілё&сябры”, трапіў ён пад фінальнае галасаванне (гурт адабраны быў з ліку 69 гуртоў) і апынуўся ў самым лепшым тузіне выканаўцаў. Гэта самае вялікае дасягненне падляшскіх музыкаў, бо найчасцей на сайце www.music.fromby.net галасуюць беларусы з Беларусі, у якіх няма ніякай свядомасці пра падляшскую музыку. Затое пераможцам пераможцаў з'яўляецца гурт „Глюкі” з Магілёва, вядомы вам як адзін з пераможцаў сёлетняга фестывалю „Басовішча”, які, дарэчы, тут жа пасля фестывалю абвясціў спыненне дзейнасці. Дзіўнае гэта, незразумелае, але паказвае, як важнымі ў музыцы з'яўляюцца піяр ды маркетынг. А пакуль што, запрашаю вас наведваць згаданы сайт, чытаць пра музыку і галасаваць перш за ўсё за падляшскіх выканаўцаў.

i_basovka@o2.pl

ГІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЯК ПРАВІЛЬНА ТРЭБА ДАРЫЦЬ СЭРЦЫ

І яшчэ адна дзяўчына вырашыла падараваць каханаму свайму хлопцу ўласнае сэрца. Толькі, у адрозненне ад Касі, якая летась хацела слаць тое сэрца эсэмэскай, Сняжанка ўздумала зрабіць крок больш радыкальны. Нават у мяне — не ў маладога ўжо дзядзечкі — дрыжыкі па скуры бягуць, калі ўяўляю ўсё гэта. Таму як Сняжаначка вырашыла аддаць сваё сэрца Антосю... жывым, пульсуючым, гарачым і трапяткім.

Нават ужо і падрыхтавала ўсё да такой адчаёва-складанай аперацыі: ножычкі, скальпялёчкі, заціскачкі розныя ды іншае хірургічнае начынне. І яшчэ невядома чым усё тое скончылася б.

Ды, на вялікае шчасце, у самы апошні момант, у пакой да Сняжанкі віхураю ўляцеў сам Антось. Ён рашуча схапіў руку дзяўчыны. Вырваўшы, адкінуў недарэчны блішчасты скальпель, на нейкі момант затрымаў дрыжачую дзявочую руку ў сваёй...

І раптам нешта ціхутка грукнула паміж пераплеценых іхніх далоняў. Раптам невыразнай гарачынёй пралілася вонкі і перадалася ўнутр. Раптам нястрымны і ўсёсакрушальны пульс ажывіў і прымусіў радасна рассмяяцца кажнюткі пальчык. Штосьці жывое, і вельмі спакойнае, і да канца спапяляючае, і такое гаючае рытмічна тахкала ў іхніх руках.

Яны крыху расціснулі рукі...

Імгненна ўзляцела і рассыпалася яркаю ўспышкай залацістая, добрая птушка паміж неадрыўных юначых вачэй. І кожная жарынка, кожная залацінка тая ператварылася ў чароўную, сакавітую ружу з водарам вільгаці на ледзь прыадкрытых бутонах. І кожны вільготны бутончык раптам раскрыўся, пацягнуўся адзін да аднаго... І склаўся ў адно імгненне ў... Хацеў напісаць „у самую дзіўную казку” — ды толькі зусім не ў казку, а...

Ну, вядома, вядома, вядома! І было яно ў іх адно. Адзінае і непадзельнае, глыбокае і сарамлівае, добрае і крыватачнае, бясконца прамяністае, вернае і закаханае.

Ваш Дзядзечка Сід
20 жніўня 2008 г., Кобрын

Польска-беларуская крыжаванка № 35

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 31:

Ліпа, дапамога, ар, мора, Адам, атол, матылёк, лірык, тулава, Тураў, баран, ганак. Лань, ліра, луг, араб, матыў, дотык, арол, ла, палёт, Куба, маг, лак, мода, ар, галава, амарант.

Zdanie	Klasa	▼	Bierz	Wół	La / Płeć	▶		Praca	▼	Bryza	Sto	▼	Zachwyty
▶	▼			Wojownik	▼	Chińskie imię	Orbita	▶		▼			▼
Konsolidacja		Niania	Smak	▶ ▼		▼	📖	Akacja			Jaki		
▶		▼	▼					▼			▼	Anioł	
Rodzina / Świat	▶				📖	Przyjaciel	Bajka	▶				▼	Adam
▼	Naród	▶				▼	📖		📖	Ina	▶		▼
	▶			Ar	Rycerz	▶					Jod	▶	
	Wojak	📖	📖	▼	📖		📖		📖	📖	...Scala	▶	
	Próg	▶					Jagnię	▶					

Каб захаваць ад забыцця

Размова з Іааннай Корх, гісторыкам Комплексу прафесійных школ з Гайнаўкі, карэспандэнтам „Беларускіх гістарычных сшыткаў”.

(заканчэнне; пачатак у 33 нумары)

— Аповеды аб эпідэміях у далёкім мінулым — займальныя і многа з іх можна даведацца, але ў даследаваннях гісторыкі абапіраюцца перш за ўсё на архіўныя матэрыялы. Што Вам удалося знайсці пра эпідэмію халеры 1831 года, калі на нашай тэрыторыі ўзнікла найбольш халерычных могілак?

— З захаваных дакументаў вядома, што паўстаў Бельскі павятовы камітэт аховы перад халерай, які дзейнічаў у 1831-1833 гадах, што непасрэдны кантроль за яго працай вёў міністр унутраных спраў Расіі, а ганаровы патранат трымаў сам цар. Камітэт увёў многа ўказанняў і наладзіў супрацоўніцтва з духоўнымі праваслаўнай, каталіцкай і яўрэйскай канфесій. Задачай духавенства было інфармаваць прыхаджан якім чынам прадухіліць заражэнне і якімі спосабамі лячыцца. Святары былі абавязаны стварыць вернікам магчымасць дэзінфекцыі растворам хлору ў прытворы храма. А сукно і спірт даваліся паліцыянтам, дзесятнікам і іншым асобам адказным за хаванне нябожчыкаў.

Аднак у нашых сёлах многія ўказанні не выконваліся. Хаця каля ахопленых халерай вёсак стаялі ахоўнікі, якія мелі сачыць, каб насельніцтва не перамяшчалася, людзі ездзілі ў суседнія вёскі, а нават і на навакольныя рынкі. Белай крэйдай трэба было памеціць хаты, у якіх былі хворыя на халеру, каб туды не заходзілі іншыя жыхары. У Бельску былі назначаны дзесятнікі і кожны з іх меў сачыць за дзесяццю дамамі, у якіх была распазнаная халера, каб не выпускаць з іх жыхароў і не ўпускаць туды людзей звонку і гэтым спосабам пазбегнуць пашырэння халеры. Самі ахоўнікі ўціралі ў цела разбаўлены хлор, каб пазбегнуць заражэння.

— Хворых на халеру трэба ж было лячыць. Як тады выглядала медыцынская дапамога?

— Спачатку ў Бельску быў толькі адзін лекар Фрузе, які павінен быў змагацца з халерай не толькі ў горадзе, але і ў многіх вёсках сённяшняй Бельшчыны ды Гайнаўшчыны. Пасля на дапамогу яму былі накіраваны лекары з Орлі і Боцькаў, хаця жыхары гэтых мясцовасцей былі супраць іх адкамандзіравання. На практыцы, дапамога лекара на вёсках была вельмі абмежаванай, а бельскі лекар скардзіўся павятоваму камітэту аховы перад халерай, што няма ў яго пастаяннай фурманкі з чалавекам, які мог бы яго вазіць да хворых па-за Бельск. Эпідэмія халеры развівалася вельмі дынамічна. У хворага паяўлялася вельмі высокая тэмпература, арганізм пераставаў прымаць ваду і здаралася, што людзі ўміралі нават за суткі ад заражэння. У такім выпадку неабходнай была вельмі хуткая ізаляцыя хворых.

— Аднак у самім Бельску медыцынская дапамога была напэўна лепшай.

— У горадзе было лепш, бо былі два шпіталі — адзін для хрысціян, а другі — для жыдоў. У іх хворыя атрымлівалі пэўную медыцынскую дапамогу.

— Яшчэ не так і даўно за ўсялякія беды абвінавачваліся жыды. Ці так было і ў мінулым?

— Некаторыя абвінавачвалі жыдоў, што тыя атручваюць хрысціянам ваду. Аднак па вёсках паўсюдным было перакананне, што эпідэмія з’яўляецца паслядоўнасцю грахоўнага жыцця. На нашай тэрыторыі эпідэміі здараліся ў сярэднім кожныя 9 гадоў, але самыя вялікія ўспыхвалі ў час войнаў. Вірусы халеры вельмі хутка развіваліся ў зборышчы войск і ад жаўнераў заражаліся людзі.

— Ці таксама ад жаўнераў распаўсюдзілася ранейшая чума?

— У XVII стагоддзі, у час шведскага патопу, каля Кленікаў стаялі шведскія войскі, а праз нашу тэрыторыю праходзілі таксама польскія атрады. Ад іх і заражаліся нашы людзі чумой. Падатлівым грунтам для развіцця эпідэміі быў тадышні нізкі ўзровень асабістай гігіены, слабое і небагатае ў вітаміны харчаванне. Вялікай смяротнасці людзей спрыяў таксама забабонны падыход да лячэння і аховы перад эпідэміяй. Людзі, каб забяспечыцца перад хваробай, насілі на шыі часнык або абсыпвалі панадворкі конскімі экскрэментамі. Калі гаварыць пра больш паспяховае забеспячэнне перад заразай, дык нашы продкі акурвалі дамы растворамі хлору, палілі вопратку памерлых і націралі цела спіртам.

— Ці вядома колькі нашых людзей памерла ад чумы ў час шведскага патопу?

— З Каралеўскай люстрацыі Падляшскага ваяводства, якая тычылася Бельскага лясніцтва з сядзібай у Лядах, можна даведацца, што цалкам апусцелі тады Істок, Карыцкі і Вітава. Іх жыхары або памерлі, або ўцяклі да сваякоў у неахопленыя эпідэміяй вёскі. Амаль цалкам апусцелі іншыя сёлы, напрыклад, у Махнатым, Асоўцы ці Моры асталося жыць толькі па адной сям’і, у Ягадніках, Новым Корніне ці Чыжах — засталося толькі па двух гаспадароў з сем’ямі. У люстрацыі захавалася даслоўна некалькі прозвішчаў, якія тычацца нашых сёл. Згадваецца ў ёй, што ў Старым Беразове астаўся жыць толькі Сцяпан Мароз з сям’ёй, у Новым Беразове — Іван Мароз з сям’ёй, а ў Шастакове — Андрэй Левачовіч з сям’ёй (усе яны гаспадарылі на адной валоцы). Былі таксама іншыя сёлы, колькасць жыхароў якіх скарацілася больш чым напалову, а прыблізна напалову паменшала насельніцтва ў Чыжыках і Койлах. У заражаных чумой хутка павышалася тэмпература, а на целе паяўлялася высыпка. З агульных падлікаў вядома, што на тэрыторыі тагачаснай Лядскай пушчы памерла каля 70% насельніцтва. Вядома, што ад іншага роду чумы, якая бушавала ў Заходняй Еўропе, на акрэсленых тэрыторыях памірала нават пад 100% насельніцтва.

— У час іншых войнаў нашы людзі таксама пацярпелі ад эпідэмій.

— У час Паўночнай вайны (1700-1721) праз нашу тэрыторыю праходзілі шведскія, расійскія і польскія войскі, якія завалаклі сюды эпідэмію чумы. Моцна ўспыхнула яна на нашай тэрыторыі ў 1708 годзе. Якраз у гэтым часе адбылося цудоўнае аб’яўленне іконы Божай Маці ў Старым Корніне, перад якой людзі маліліся, збаўляліся ад эпідэміі і аставаліся ў жывых. У гэтым самым часе людзі ўцякалі ад чумы на гару Грабарку, там таксама маліліся і збаўляліся ад хваробы. Мяркуецца, што на нашай тэрыторыі ў час Паўночнай вайны ад чумы памерла 40-50% насельніцтва. Не ведаю чаму ў царкоўных даведніках пішацца пра збаўленне на Грабарцы людзей ад халеры, калі яна паявілася ў Еўропе толькі ў 1816 годзе.

— Нашы людзі хадзілі таксама ў іншыя цэрквы збаўляцца ад хвароб.

— У час Паўночнай вайны людзі хадзілі маліцца ў Пухлы, Райск. Прызнанне здабыла таксама Святая Вада, якая цяпер у руках католікаў.

— У час Першай сусветнай вайны людзі паміралі ад тыфу. Ад яго памерлі мой прадзед і брат маёй бабулі з Арэшкава.

— Тады людзі найчасцей паміралі ад халеры і тыфу, але яшчэ раней эпідэмія халеры ўспыхнула ў нас у 1855 годзе. Кранула яна ў галоўным жыхароў вёсак распаложаных побач Бельска, а ў меншай ступені людзей з сёл сённяшняй Гайнаўшчыны, за выключэннем Чыжоўскага прыхода, дзе памерла тады каля 300 чалавек.

— Вы разам з моладдзю рэалізавалі таксама іншыя праекты з гістарычным ухілам.

— Моладзь Комплексу прафесійных школ пад маім наглядам вяла раскопкі на гарадзішчы побач Збуча і запісвала тапанімы ў Арэшкаве і яго наваколлі.

— Вы раней публікавалі свае матэрыялы ў „Беларускіх гістарычных сшытках”.

— Я намерваюся публікаваць выбраныя матэрыялы ў гэтым выданні, але, занятая работай у школе і згаданымі праектамі, я не паспела закончыць распачатых работ. Зараз збіраю матэрыялы аб прыхадскім школьніцтве ў Старым Корніне. Камплектую таксама матэрыялы для манаграфіі пра роднае Вітава. Аднак, трэба будзе ехаць за матэрыяламі ў Гродзенскі архіў, бо ў Беластоцкім архіве і ў нашых прыходах матэрыялаў малавата.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Спрэчка, здаецца, на фінішы?

працяг ☞1

конт гісторыі Царквы. Урад таксама прасіў у нас прабачэння за разбурэнне цэркваў у Польшчы. Прэзідэнт гэтага не зрабіў.

У сваю чаргу мы неафіцыйна даведаліся, што Апостальская нунцыятура Рыма-каталіцкага касцёла ў Польшчы прыхіляецца да пазіцыі Праваслаўнай царквы ў справе 24 храмаў і здзіўляецца пазіцыі кіраўніка польскай Грэка-каталіцкай царквы архіепіскапа Яна Мартыняка, які спасылаўся на тое, што пры вырашанні гэтай справы неабходная кансультацыя з Ватыканам. Пры нагодзе дайшла да нас іншая неафіцыйная інфармацыя, што ўлады Варшавы (якія, падобна як і ўрад, выводзяцца з Грамадзянскай платфомы) ужо ад дзесяці гадоў робяць праваслаўным цяжкасці з пабудовай царквы на Урсынаве, калі адначасова без таргоў перадаюць участак у ваколіцах гэтага сталічнага пасёлка каталікам, а іншы — каталіцкім манашкам-бетанкам (таму самому ордэну, якога сёстры былі эксмітаваныя з Казімежа-на-Вісле).

Пра стан негацыяцый паміж грэка-каталікамі і праваслаўнымі пры ўдзеле ўрада спыталіся мы ў Міністэрстве ўнутраных спраў і адміністрацыі, якое курыруе пытанні веравызнанняў у Польшчы. Паставілі мы пытанні: які ўмовы мусяць быць выкананы, каб паразуменне было дасягнута і калі канчаткова можа дайсці да яго, у якой атмасферы адбываецца дыялог паміж праваслаўнымі і грэка-каталікамі ў ходзе перамоў з удзелам урада? Прэс-сакратар МУСіА Віялета Папроцкая адказала нам сапраўды па-дыпламатычнаму:

— Гэтае паразуменне, як здаецца [!!! — М.Х.], мае давесці да супольнага саставлення абодвума Касцёламі пераліку нерухомасцей, якія неабходныя ім для гарантавання вернікам душпастырскай апекі. Улічваючы складаны характар прадмету ведзеных кансультацый, якія непасрэдна адносяцца да вельмі далікатных пытанняў, датычных права ўласнасці на нерухомасці, на якіх стаяць цэрквы, МУСіЯ не ў змозе прадбачыць калі і з якім вынікам будуць яны завершаны.

Дэпутат Яўген Чыквін, у гэтым тэрміне Сейма віцэ-старшыня камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей, у якога мы спыталіся, чаму такой важнай з’яўляецца вырашэнне гэтай праблемы і ці не была зроблена памылка ў 1991 г. у ходзе прац над законам аб стасунках РП з Праваслаўнай аўтакефальнай царквой, заявіў:

— Ёсць добрая воля з боку ўрада. Гэта добра. Дзяржава мусіць вырашыць гэтую праблему, бо рэлігійныя канфлікты нікому непатрэбныя.

Паказваем рэканструкцыю даўніны

26 ліпеня г.г. у агратурыстычным гаспадарстве „Купала" Ірыны і Зіновія Галёнкаў у Арэшкаве-Парыеве адбыўся X Народны фэст „Купалінка". У багатай праграме мерапрыемства было выступленне сярэдневяковых рыцараў, паказ іхняга змагання ды азнаямленне публікі з тагачасным жыццём. Выступілі супольна заўзятары са згуртаванняў „Навія" з Суража і „Тшаскавіца" з Беластока. Найстарэйшым з гэтых цікавых людзей з'яўляецца Марыюш Канечны, настаўнік у беластоцкай спецыяльнай школе, з якім я правёў гутарку.

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

— ***Што прэзентуеце?***

— Нашы згуртаванні паказваюць гістарычную рэканструкцыю ранняга сярэдневякоўя. На гэтых землях у той час сутыкаліся руская, балцкая і мазавецкая культуры — ужо тады было тут памежжа. І мы стараемся тыя абставіны рэканструяваць, паказаць як тады выглядалі ваяры, як яны змагаліся. Прывезлі мы і свае рэчы, не ўсе, бо іх у нас многа і няма магчымасці ўсяго забраць з сабою. Маем браню, шлемы, рукавіцы, налокатнікі, тапор, кап'ё з Данілова і інш. Зацікаўленым асобам расказваем, паказваем рэканструкцыю даўніны. Маем вытканы ў Беларусі пояс, сярмягу, літоўскі і ўсходні панцыры. Маем з сабою палаткі, якія тады ўжывалі на захадзе Еўропы, а як выглядалі нашы — не ведаем.

— ***А хто рэканструюе металічныя рэчы?***

— Зброю робяць спецыялісты, не кавалі, але мечнікі, збройнікі, шлемы выконвае шлемнік. Бо ў час паказу перад публікай меч не можа зламацца і вастрыё паляцець дзесь на людзей; таксама тапор. Але іншыя дробязі, як кальчугу, можна выплесці ўласнаручна — такая работа займае ад аднаго да трох месяцаў, выраб важыць 13 кілаграмаў.

— ***Колькі вас, заўзятараў?***

— У маёй камандзе 12 асоб і ў Суражы будзе каля дзесяці. Маем аднаго дванаццацігодка, бо ён і ягоныя бацькі вельмі гэтага хацелі. Маем двух семнаццацігодкаў, а апошнія маюць звыш дваццаці і трыццаці гадоў.

— ***Ці ў нашым рэгіёне адбываюцца турніры, змаганні?***

— Ёсць, найбліжэй у Збучы, на гарадзішчы. Таксама вельмі атракцыйны фэст у Драгічыне. Сёлета быў там дракар, яхта вікінгаў, якою адтуль паплылі ў мора. Адбываецца фэст у Суражы, у Швейцарыі пад Сувалкамі. Шмат іх на Падляшшы і ў цэлай Польшчы.

— ***Ці вашы прэзентацыі на фэстах прыгадваюць гісторыю, ці з'яўляюцца адно цікавінкай?***

Група любіцеляў ранняга сярэдневякоўя з Суража і Беластока ў Арэшкаве. Пасярэдзіне Марыюш Канечны

— Гэта гісторыя. Вельмі часта суправаджаюць нас крамы рукадзельнікаў — ганчароў, кавалёў, ёсць шкураныя і драўляныя вырабы, разьба; наяўнасць іх залежыць ад размаху фэсту. Многія асобы апранутыя ў колішнюю вопратку, прысутнічаюць ваяры, паказваюцца іх змаганні і яны, здаецца, найбольш цікавяць маладых хлопцаў.

— ***А ці на нашай тэрыторыі адбываліся бітвы?***

— Пра гэта складана сказаць. Шукаюць іх слядоў гісторыкі і археолагі.

— ***Колькі важыць увесь строй ваяра?***

— Увесь час, калісь і цяпер, узбраенне ваякі важыць 20-30 кілаграмаў. Гэта такі груз, які дарослы мужчына можа ўзяць на сябе астаючыся мабільным — фізіка для ўсіх перыядаў аднолькавая. Меч важыць каля кілаграма, хаця ў позняе сярэднявечча бываў цяжэйшы для збіцця вершніка.

— ***У вас на шыі розныя начэпкі — так было ў сярэднявеччы?***

— Адна, гэта фігурка Светавіда з Воліна. Далей, сімвалічны тапарок, які насілі ў Кіеўскай Русі; меў ён прыносіць шчасце. Гэта язычніцкія сімвалы. А трэці, гэта крыж візантыйскага дызайну. Шматлікія гісторыкі лічаць, што хрысціянства прыйшло да нас з Візантыі.

— ***Хто ў вас камандуе?***

— У маёй дружыне ёсць старшынство, асобы старэйшыя, больш спрактыкаваныя, якія ведаюць сутнасць справы, умеюць сарганізаваць паказ і яны вядуць дружыну. А малодшых, якія знаёмяцца з гэтай прыгодай, трэба навучыць, бо змагацца з мячом гэта справа складаная, каб бяспечна было і нам, і публіцы. Бо гэтая зброя і з рукі можа вырвацца, і трэба зважаць, каб каго не зачапіць. Гэта можа так грозна не выглядае, бо зброя прытуплена, але ж яе край мае два міліметры і яна, аднак, небяспечная.

— ***Ці ў час сваіх гістарычных заняткаў карыстаецеся сярэдневяковай кухняй?***

— У час гістарычных фэстаў маем кухню, маем кацялкі, ражны. Стараемся варыць кашу, панцак, які калісь спажывалі. На нашых землях пераважала мяса з дзічыны, але ў Цэнтральнай Польшчы больш было свініны і ялавічыны. Па касцях з раскопак відаць, што былі ўжо авечкі і козы. Вядома, спажывалі таксама рыбу. Аднак гэта ўсё прыблізжэнне, бо чым далей у мінулае, там менш ведаем. Гэтая таямнічасць вабіць мяне.

— ***Ці за ўсходняй мяжой таксама ёсць такія як вы заўзятары? Ці трымаеце з імі кантакт?***

— Ёсць у Беларусі, Літве, Украіне. Сустракаемся з імі на фэстах, прыязджаюць да нас. Зараз група з Суража паехала ў Беларусь...

— ***Ці іхнія сярэдневяковыя ўборы падобныя на нашы?***

— У раскопках цяжка знайсці матэрыял, які на працягу тысячы гадоў захаваўся б у зямлі. Ёсць шмат скандынаўскіх рысункаў. На ўсход ад Польшчы ёсць вельмі добрыя глебы і там некалькі кашуль захавалася, сведчачы, што тады ўжывалі воўну і лён; знаходзілі таксама паясы. Мы стараемся рэканструяваць гэта па рысунках.

— ***Ездзіце змагацца пад Грунвальд?***

— Я там быў, але як турыст, бо, на жаль, мой строй не падыходзіць, ён з X-XI стагоддзя, а Грунвальд гэта пачатак XV стагоддзя; іншае таксама ўзбраенне. Варта туды паехаць, каб пабачыць найбольшую ў Польшчы і адну з найбольшых у Еўропе рэканструкцыю гістарычнай бітвы. Паўтысячы ваяроў змагаецца адначасна — гэта ўражвае!

— ***На канец спытаю, адкуль у людзей бярэцца зацікаўленне мінуўшчынай?***

— Я гэтае пытанне чую ўжо не першы раз. Ну, апрача таго змагання, здаецца, цікавасць да сваіх каранёў. Гэта цікавасць чалавека адкуль ён, гэта захаванне памяці, каб яна не прапала. Ці гэта назавем лакальным ці агульнакраёвым патрыятызмам, важнае, каб гэта аставалася ў сэрцах людзей і тады тая памяць захаваецца. Мяне абурае, што маючы свае як жа прыгожыя стараславянскія імёны мы выбіраем Кевін, Патрык, Анджаліка. Такія імёны ёсць у кожнай культуры, узяць бы ў прыклад Літву, дзе колішнія імёны надалей ужываюцца; імёны глыбінныя, яны іх не затрацілі, а ў нас гэта недзе размылася. І вось пракладваем дарогу вяртання, прыгадання мінулага, бо варта, каб кожны ведаў, адкуль яго род, кім ён. І варта ведаць, што ў мінулым народы былі перамешаныя, язычніцкі перыяд звязваў іх. І гэта нам пуцяводнае для згоды паміж канфесіямі і нацыямі. У агульнасці, аднак, справа ў цікавасці да свайго мінулага.

— ***Дзякую за размову.***

Гадавіна вызвалення Седльцаў

31 ліпеня ў Седльцах адзначалася 64 гадавіна вызвалення горада ад гітлераўскай акупацыі. У гэты дзень на ваенных могілках памяць загінуўшых ушанавалі дыпламаты, прадстаўнікі самаўрадавых улад і ветэраны. У іх ліку былі, між іншым, І сакратар Пасольства Рэспублікі Беларусь **Дзмітры Выбарны**, намеснік старшыні Рады горада **д-р Адам Бобрык**, сакратар Управы горада **Славамір Мархель**, гарадскі дэпутат **Збігнеў Півонскі**, віцэ-стараста **Бартламей Куркус** з павятовым дэпутатам **Тамашом Марцінюком**, а таксама **Войцех Грахоўскі**, які прадстаўляў дэпутатку Сейма **Станіславу Пшондку**. Выступаючы ад імя ветэранаў **Генрык Мядушэўскі** адзначыў неабходнасць захавання гістарычнай

Фота ВІТАЛЬДА БОБРЫКА

Злева — у першым радзе: д-р Адам Бобрык, Славамір Мархель; у другім радзе: Дзмітры Выбарны, Збігнеў Півонскі і Войцех Грахоўскі

памяці аб гэтых незвычайна важных здарэннях, а таксама аб гераізме савецкіх салдат і польскіх партызан. Адзначыў ён, што нягледзячы на тое, што за Седльцы цэлы тыдзень вяліся зацятыя баі, удалося да мінімуму абмежаваць знішчэнні, дзякуючы засцерагальным дзеянням Арміі Краёвай. У нашым горадзе дайшло да баявога садзеяння салдат І Беларускага фронту Чырвонай Арміі і нашых партызан, што станоўча паўплывала на ход барацьбы.

У гэты ж дзень у Рэгіянальным музеі адбылася адкрытая сустрэча з жыхарамі горада, у час якой **Эдвард Купуўка** зачытаў даклад „Бітва бранятанкавых часцей за Седльцы 24-31 ліпеня 1944 года і яе ўспрыманне". У сустрэчы ўдзельнічала шматлікае кола любіцеляў гісторыі і ветэраны. Вялікай падзеяй была таксама дэманстрацыя нямецкакй кінахронікі аб змаганнях за наш горад. Кінахроніка паходзіць са збораў сядлецкага калекцыянера **Адама Кшэскага**.

(аб)

Фота ВІТАЛЬДА БОБРЫКА

Самаўрадавыя ўлады разам з ветэранамі

Я захапіўся беларускай літаратурай!

З Томасам ВАЙЛЕРАМ, маладым перакладчыкам польскай, рускай і беларускай літаратур на нямецкую мову, жыхарам горада Карлсруэ, гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК

— Рэдка сустракаем у свеце перакладчыкаў беларускай літаратуры. І, асабліва, сярод маладога пакалення...

— Я ведаю, што вельмі цяжка сустрэць перакладчыкаў з беларускай на нямецкую мову. Менавіта таму я паставіў сабе такі выклік, тым больш што тыповы немец не мае паняцця аб тым, што адбываецца ў сучаснай беларускай літаратуры. Маё рашэнне падмацавалі пабыўкі ў Беларусі. Я там яшчэ больш захапіўся беларускай мовай і літаратурай.

— Якіх аўтараў Вы перакладалі?

— Я перакладаў Альгерда Бахарэвіча, паэтаў Глеба Лабадзенку, Сяргея Прабудскага...

— Вы назвалі маладых беларускіх літаратараў? Ваш выбар — гэта справа паразумення ў пакаленні?

— Так, для мяне гэтак зручней. Я трымаю кантакт з маладымі аўтарамі і калі чагосьці не разумею, я магу ў іх дапытвацца. Сапраўды, мы адно пакаленне. Думаю, цяжка перакладаць аўтараў, якія жылі сто або больш гадоў таму, у іншым часе, свеце.

— Наколькі, паводле Вас, мысленне беларускай літаратурнай моладзі адкрытае на свет?

— Гэта еўрапейская літаратура, вельмі мне блізкая.

— Ці ёсць рэальная магчымасць публікацыі і папулярызацыі беларускіх аўтараў у Нямеччыне?

— Пакуль адзінай магчымай формай публікацыі маладых з'яўляецца інтэрнэт. Цяжка знайсці ў нас выдавецтвы, якія былі б зацікаўлены кніжным выданнем. Проста, амаль ніхто ў нас не ведае, што адбываецца ў беларускай літаратуры. Ды і я сам малады перакладчык. Так што тут такія складанасці...

— А ці ў свядомасці нямецкага чытача існуюць беларускія аўтары савецкага і ранейшых перыядаў?

— Існуе „Анталогія беларускай літаратуры", якая змяшчае класіку XX стагоддзя. Там маладых аўтараў не памясцілі. Хоць, як мы сказалі, звычайны немец не мае паняцця пра беларускую літаратуру.

— Ці існуе рэальны шанц папулярызаваць беларускую літаратуру ў Нямеччыне?

— Гэта доўгі марудны працэс, трэба пачынаць усё ад нова. Аднак пры ўсіх складанасцях я думаю, што такі шанц ёсць. Між іншым шанц у паразуменні пакалення маладых.

— Якія культурныя цэнтры могуць да гэтага спрычыніцца?

— Напэўна ўніверсітэты, дзе працуюць аддзяленні славістыкі, бо ў Нямеччыне няма асобнай беларускай філалогіі, а беларуская і ўкраінская мовы выкладаюцца разам з рускай філалогіяй. Я сам вучыўся ва ўніверсітэце ў Лейпцыгу. Там аднак не было магчымасці вывучаць літаратуру, там працуе адно спецыяліст па мовазнаўстве. Наогул, у Нямеччыне цяжка знайсці спецыялістаў па беларускай мове...

— Ваш прыклад дае надзею на добрыя змены. Скажыце, ці нешта Вас асабліва ўразіла ў нашым літаратурным свеце?

— Беларускія аўтары, калі рашаюцца пісаць па-беларуску, ведаюць, што кола іх чытачоў будзе абмежаванае. Аднак яны выбіраюць сваю мову і хочуць на ёй выказвацца. Гэта мяне захапляе! З другога боку ў беларускай літаратуры вялікія магчымасці, тут яшчэ многае можна і трэба зрабіць.

— Бачу што пераходзім ужо на г.зв. шведскі пункт гледжання, які абвяшчае: „як вам добра, што ў вас так кепска, бо ў вас столькі можна зрабіць"?!

— Гэта прыблізна так *(смяецца)*!

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК
Фота аўтара



КАБІНЕТ-МУЗЕЙ
БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ
ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ

Наяўнасць якога-небудзь музея заўсёды надае маючай яго ўстанове рысы сур'ёзнасці і грунтоўнасці. Гэта зразумела, бо музей увасабляе сувязь з нейкім пройдзеным шляхам, паказвае лучнасць сённяшняга пакалення да спраў, якія рабілі яго продкі ці папярэднікі.

Музей не заўсёды мусіць быць сусветнавядомым. Дастаткова, каб пра яго ведалі тыя, хто апантаны сваёй справай, хто рупіцца на ніве захавання тых ці іншых традыцый. Гэтыя словы наўпрост тычацца кабінета-музея беларускай народнай культуры, які дзейнічае пры Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Для таго, каб пазнаёміцца з даным кабінет-музеем, зусім неабавязкова фізічна ўваходзіць у яго. Набраўшы на сваім камп'ютары адрас у інтэрнэце http://museum.na.by, цікаўны інтэрнэт-карыстальнік адразу апынецца ў сценах музея, які быў адкрыты на 85-годдзе БДУ, у 2006 годзе.

„На адным з найстарэйшых факультэтаў галоўнай альма-матэр краіны гасцінна адчыніў дзверы фальклорна-этнаграфічны кабінет-музей беларускай народнай культуры, дзе прадстаўлена больш за 300 экспанатаў, сабраных у розных кутках нашай Бацькаўшчыны. Святой апякункай музея была абрана Ефрасіння Полацкая, выява якой упрыгожвае цэнтральную сцяну кабінета", — такімі словамі сустракаюць віртуальнага наведвальніка супрацоўнікі музея праз свой афіцыйны сайт. Варта адзначыць, што сайт музея аздоблены мноствам фотаздымкаў.

На сайце вялікая колькасць рубрык. Зважаючы на тое, што ў кабінеце цяжка прадставіць шырокія экспазіцыі, узнікае пачуццё вялікай павагі да тых людзей, якім удалося распавесці пра многае ў чатырох сцянах праз чатыры экспазіцыі — „Культура і побыт нашых продкаў", „Вырабы сучасных беларускіх майстроў", „Праваслаўны абраз Маці Боскай на Беларусі" і „Культура Беларусі: навуковая і навукова-папулярная літаратура".

Музей арганізуе і экскурсіі. Прычым не толькі як мікравандроўкі па ўласных экспазіцыях, але і выязныя. Іх колькасць сапраўды ўражвае — больш за паўсотні па ўсіх кутках Беларусі.

Сярод мноства розных рубрык сайта найбольш цікавымі падаюцца „Майстар-класы", „Кніжная палічка", „Беларускі народны каляндар" і „Беларускі народны гумар". Што тычыцца „Майстар-класаў", то іх віртуальна наведаць немагчыма, але даведацца пра тое, дзе можна навучыцца бісерапляценню, саломапляценню ці залаташвейнаму мастацтву зацікаўленай асобе можа быць вельмі карысна.

„Беларускі народны каляндар" надзвычай падрабязна распавядае пра кожны месяц і амаль кожны дзень у годзе. Сярод гэтых расповедаў — парады, што лепей рабіць, а чаго ўвогуле рабіць у азначаны час не трэба.

„Кніжная палічка" кабінет-музея — гэта свайго роду музейная бібліятэка, дзе сабрана больш за 120 кніг. Зразумела, гэта не надта вялікая колькасць, але невыключана, што менавіта тут можна знайсці патрэбную кніжку па фальклоры ці этнаграфіі.

Нават той, хто не адчувае ў сабе вялікай цягі да вывучэння беларускага фальклору, наўрад ці абміне рубрыку, звязаную з гумарам. Тут можна пасмяяцца не толькі з даўніх анекдотаў, але і з сучасных частушак студэнтаў філалагічнага факультэта БДУ.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

Алімпійскія „дажынкі"

Вось і скончылася пекінская алімпіяда. Па-рознаму можна ставіцца да спартовых спаборніцтваў сучаснасці, якія часцяком праходзяць на фоне палітычных падтэкстаў і супярэчнасцей. Бясспрэчна адно — такія форумы як алімпіяда даюць магчымасць кожнай асобнай нацыі паказаць сябе іншым, а ў межах адной краіны хоць у нейкай ступені дазваляюць салідарызавацца розным слаям грамадства. Бо амаль усе перажываюць за выступы спартоўцаў — прадстаўнікоў сваёй краіны.

Апошні тыдзень алімпіяды стаўся больш чым паспяховым для беларускіх атлетаў. Выдатнага дасягнення дамаглися нашы весляры. У адзін дзень яны здабылі два залатыя медалі. Браты Андрэй і Аляксандр Багдановічы першынствавалі на кіламетровай дыстанцыі ў каноэ-двойцы. На такім жа адрэзку мацнейшым стаў экіпаж байдаркі-чацвёркі (Раман Петрушэнка, Аляксей Абалмасаў, Артур Літвінчук, Вадзім Махнеў). Пазней Петрушэнка з Махневым паўтарылі свой бронзавы вынік чатырохгадовай даўніны на байдарцы-двойцы на дыстанцыі 500 м.

Бліскучы вынік паказаў штангіст Андрэй Арамноў, які паклаў у беларускую скарбонку першае золата. Ураджэнец Барысава ў катэгорыі да 105 кг прытым усталяваў тры новыя сусветныя рэкорды. Проста выдатна выступіла і кідальніца молата Аксана Мянькова — надзвычай стройная для гэтага віду спартоўка, ураджэнка Крычава, апярэдзіла ўсіх на планеце і стала алімпійскай чэмпіёнкай.

Да вагі золата можна прыраўняць і поспех шматборца Андрэя Краўчанкі. Ён не толькі не згубіўся ў кампаніі „рыцараў дзесяці якасцей", але і заняў высокае і галоўнае заслужанае другое месца, вырваўшы сваё срэбра літаральна „на зубах". Бронзавы медаль для Беларусі прынёс ураджэнец Дагестана Мурад Гайдараў — гэты барэц стаў бронзавым прызёрам у вольнай барацьбе (катэгорыя да 74 кг). Заўважым, што ў гэтым відзе барацьбы Беларусь не мела медаліста 12 гадоў з часу алімпіяды ў Атланце.

Эстэтычныя пераканаўчыя акорды ў апошнія дні зрабілі беларускія дзяўчаты ў мастацкай гімнастыцы. Іна Жукава была ўганаравана срэбрам у індывідуальным шматбор'і, а наш калектыў юных дзяўчат, за які выступалі Алеся Бабушкіна, Анастасія Іванькова, Зінаіда Луніна, Глафіра Марціновіч, Ксенія Санковіч і Аліна Туміловіч, атрымаў на шыю па выніках групавых практыкаванняў камплект бронзавых медалёў.

З тых, хто не трапіў у прызёры варта пахваліць жаночы эстафетны квартэт, які ў фінальным забегу 4 па 400 метраў заняў 4-е месца і прытым усталяваў новы нацыянальны рэкорд.

Усяго ж на рахунку беларускай дружыны 19 медалёў (4 залатыя, 5 сярэбраных і 10 бронзавых), а на п'едэстал узыходзілі ажно 30 нашых спартоўцаў. У цэлым гэта найвышэйшае дасягненне айчыннага спорту за час суверэнітэту. Па якасці ўзнагарод Беларусь заняла высокае 16-е месца ў свеце і 9-е сярод еўрапейскіх краін.

А вось як выглядае дваццатка першых краін па агульнай колькасці здабытых медалёў: ЗША — 110, Кітай — 100, Расія — 72, Вялікабрытанія — 47, Аўстралія — 46, Нямеччына — 41, Францыя — 40, Паўднёвая Карэя — 31, Італія — 28, Украіна — 27, Японія — 25, Куба — 24, Беларусь — 19, Іспанія і Канада — па 18, Нідэрланды — 16, Бразілія — 15, Кенія — 14, Казахстан — 13, Ямайка — 11. Менавіта гэты неафіцыйны залік дае больш выразную агульную выніковую карціну мінулай алімпіяды.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Расказ Лідзіі Вярбіцкай з Трасцянкі

— Нарадзілася я 25 мая 1926 года ў Агароднiках, што ў Нарваўскай гміне. Мае бацькі Кузьма і Люба мелі вялікую, у 20 гектараў, гаспадарку. Нас, дзяцей, у бацькоў было чацвёра: Марыя, Сярожа, я і Жэнік. Ад малых гадоў трэба было памагаць у гаспадарцы. З 1935 года мы жылі на калёніі. Я хадзіла ў сваю школу ў Агароднiках. Там вучыла настаўніца Данута Модэль. Яна была з мясцовай памешчыцкай сям'і.

Дачушка настаўніцы вельмі любіла Ліду і вучаніца часта апекавалася дзяўчынкай. За гэта і за тое, што Лідка вельмі добра вучылася, яна ў 1937 годзе паехала на экскурсію ў Варшаву і ў Гданьск, на ўзбярэжжа. І нават каталася на круізным лайнеры „Баторы". Грошы на экскурсію далі настаўніца, бацькі і школьны інспектар — усе па 5 злотых.

Экскурсію малая Ліда апісала ў нататніку, які захаваўся да сёння. Тое запісванне пераняла яна па бацьку, які ваяваў быў з японцамі ў Маньчжурыі ў 1904-1906 гадах і запісваў усё падрабязна далёка ад дому. Але аб гэтым дачка Ліда і ўсе ягоныя дзеці даведаліся ажно ў 1991 годзе, калі прыбіралі старую клуню і знайшлі бацькавы запіскі з далёкай вайны, калі яго ўжо амаль трыццаць гадоў не было ў жывых! Бацька памёр у 1963 годзе. Гэты

бацькаў нататнік перахоўваецца ў сямі'і як каштоўны скарб!

Лідзін бацька пры саветах працаваў у мясцовым сельсавеце бухгалтарам. Пры немцах у Агароднiках быў добры солтыс і ніхто Кузьму Леановіча не выдаў немцам і так не трапіў ён у лік расстраляных у Васьках.

— Немцы толькі выселілі нашу сям'ю з калёніі ў вёску, каб мы не дапамагалі партызанам. Тады тата выкапаў зямлянку, паставіў у ёй печку і так мы жылі пад немцамі, — працягвае свой расказ спадарыня Ліда. — Вясной 1944 года сталі мяне браць на прымусовыя работы. Завезлі ў Супрасль і там перад адпраўкай у Прусію абучалі нас, маладых, даіць кароў. Выратавалі мяне рускія дзяўчаты, якія нібыта сталі сварыцца, каб адвярнуць увагу нямецкага стражніка. Мне далі знак, каб я ўцякала. І я пайшла ў будынак, а там трапіла на добрую жанчыну, якая мяне вывела пад царкву, дзе цукеркамі гандляваў мой сваяк. Ён і прывёз мяне на веласіпедзе да бацькоў. Гэта было 21 мая — на Івана. Мяне бацькі хавалі да фронту, а бацька даў майму сваяку за той шчаслівы прывоз мяне з Супраслі двое парасят...

... Так што для мяне вайна скончылася добра. У 1948 годзе я выйшла замуж за прыстойнага хлопца Пятра Вярбіцкага. Вяселле было ў лютым, а ў чэрвені майго мужа забралі ў войска. Жыла я са свёкрамі Міхалкам і Настусяй Вярбіцкімі 2 гады і 4 месяцы. А калі муж вярнуўся, пайшлі ў нас дзеці. У 1951 годзе нарадзілася дачка Маня, а ў 1954 г. — другая дачка, Жэня. Мы абраблялі і невялікую гаспадарку, і муж працаваў у гмінным кааператыве ў Нарве, дочкі вучыліся. Потым пайшлі на працу. Малодшая — Жэня, як адзіная ў Трасцянцы, скончыла Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве. І старэйшая Марыся, і малодшая Жэня, якая працавала настаўніцай, жывуць цяпер у Беластоку. Пры малодшай жыву і я...

... Цяпер у родную Трасцянку, у сваю хату, прыязджаем на лета, бо тут ціха і спакойна, і на могільнік блізка, дзе ўжо дваццаць гадоў ляжыць мой муж Пеця. І толькі ў мінулым годзе я пабывала ў Супраслі, глядзела музей ікон і ўспамінала, як мне з Супраслі ўдалося ўцячы ад немцаў і іхняй няволі. Так добра мне Бог даў, дзякуючы цудатворнай іконе!

... Яшчэ жывуць мае два браты: адзін у Беластоку, другі ў Агароднiках. Толькі старэйшая мая сястра Марыя ўжо памерла. Яна пакоіцца аж у Баранавічах у Беларусі. Калі пасля вайны савецкія агітатары намаўлялі на выезд, дык яна рашылася паехаць. Не было ёй кепска, там вывучылася на краўчыху, добра шыла, і людзі яе шанавалі...

Слухаючы расказ Лідзіі Вярбіцкай, думаецца мне, што і яна таксама добра шыла, бо і ніжэйпадпісаная не раз прасіла ў яе што-небудзь пашыць. А якая рукадзельніца з яе! І сурвэткі, і палавічкі яшчэ і цяпер умее вязаць кручком. І наогул не нахваліцца яе дабрыні і гасціннасці! Такіх суседак жадаю ўсім!

РУТА

У Дашах свята...

Дашоўскія жанчыны вядомыя ў Кляшчэлеўскай гміне грамадскай дзейнасцю. Арганізавалі яны фальклорны гурт „Каліна", які паспяхова прэзентуецца на культурных мерапрыемствах і здабывае прызнанне публікі. Мэта ўдзельнікаў гурту — падтрымліванне культурнай спадчыны і захаванне ў памяці даўніх песень і абрадаў, непаўторнага фальклору і традыцыі продкаў. Каб ажыццявіць ідэю, завязалася ініцыятыўная група, а Агнешка Пякуцін і Таіса Барысюк (мясцовая гмінная радная) падрыхтавалі праект „Што нам у душах грае — лета з традыцыяй" у рамках конкурсу, аб'яўленага Еўрарэгіёнам „Белавежская пушча" ў рамках праграмы „Дзейнічай лакальна VI" Польска-Амерыканскага фонду свабоды, рэалізаванай Акадэміяй развіцця ў Польшчы. Мэтай удзельнікаў праекта было сарганізаванне вясковага фэсту і шырокае запрэзентаванне „Каліны" мясцовай грамадскасці. Праект быў адобраны і самадзейнікі з пачаткам чэрвеня прыступілі да яго рэалізацыі. Пачалася падборка рэпертуару і рэпетыцыі. Члены калектыву арганізавалі майстар-класы для дзетак і моладзі па выкананні аздабленняў з тонкай каляровай паперы, затым іх працы былі выкарыстаны для ўпрыгожання сцэны ў час канцэрта.

У нядзелю, 3 жніўня, з самай раніцы прыкмячаўся рух на вуліцы. Ні аб чым іншым не гаварылася толькі аб фэсце. Надвор'е паспрыяла арганізатарам ды і публіка не падвяла. У час канцэрта калектыў „Каліна" запрэзентаваў традыцыйны абрад каравая, якім пасля абдароўвалі публіку. Выступалі маладзёжныя гурты з Кляшчэляў „Mixtura" і „Fantazja", дзіцячы калектыў „Гілочка" з Чаромхі. Фурор выклікаў ансамбль „Катрынка" з Беларусі, які пакарыў публіку каляровымі ўборамі і звонкай песняй. Апошняй выступіла „Маланка". Мерапрыемства завяршылася гучнай забавай, а да танца падыгрываў гурт „Vegas". Варта адзначыць, што ў час імпрэзы можна было пакаштаваць смакавітых страў і мясных вырабаў на адмысловым прылаўку, якія падрыхтавалі самі арганізатары. Дашоўская публіка і іх госці пакарысталіся затым нагодай, каб успомніць мінулыя будні і пераканацца, што сапраўды ў іхных душах іграе.

(ус)

Адгаданка



1. рух, напр. у шахматах, 2. тонкая драўляная дошчачка для крыцця даху, 3. самачыннае пакаране без ведама ўлад і суда, лінч, 4. прозвішча аўтара „Альпійскай балады", 5. адваротны бок манеты або медаля, 6. у ім ноздры, 7. мішэнь, месца, куды накіроўваецца ўдар ці стрэл, 8. вечназялёная расліна з белымі ягадамі, якая паразіруе на іншых дрэвах, 9. мужчынскі голас, 10. атрутнае рэчыва (англ. *lewisite*), 11. тоўсты кардон, насычаны воданепранікальным рэчывам, які выкарыстоўваецца як дахавы і ізаляцыйны матэрыял, 12. прозвішча заснавальніка беларускага мовазнаўства (1861-1931), 13. член манаскага ордэна „Таварыства Ісуса", 14. высокі двухколы воз на Крыме і на Каўказе, 15. прыбор для вымярэння атмасфернага ціску, 16. генератар пастаяннага току, ад якога назва вядомай мінскай спартыўнай каманды, 17. абрэвіятура хваробы, якая развіваецца на фоне інфекцыі вірусам імунадэфіцыту чалавека, 18. салата, 19. назва расійскаў аўтаномнай рэспублікі з цэнтрам у Сыктыўкары.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — амерыканская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 30 нумара

Агонь, вучань, імам, муж, рана, рыза, Унеча, цуд.

Рашэнне: **І дурань можа нечаму навучыць разумнага.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.
Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Генё на шэнгенскай мяжы

Тэкст і фота Міра ЛУКША

Генё Лукша і не думаў стаць зоркай тэлебачання. Не так ён сам, як ягоныя кеды прыцягнулі пад тэлеэкраны і да старонак газет, ды настолькі, што чытачы пісалі ў інтэрнэце: *Cała Polska kibicuje Gienkowi!* І ўбачылі яго ад сівеючай галавы да пят абутых прынцыпова ў „трампкі-галёўкі". Цяпер гэты спартыўны танны абутак карэйскай вытворчасці афіцыйна завуць у краіне „чачэнкамі". Бо мянушку мае Генё якраз „Чачэн", пра што неадкладна напісалі таксама агульнапольскія і тутэйшыя газеты. Выступіў Генё ў поўным вобразе як абвінавачаны ў *wykroczeniu*, хоць вельмі рэдка ў поўны рост у медыях выступіць могуць злачынцы, асабліва жорсткія праступнікі закону, ды па спецыяльным рашэнню правасуддзя. Мог бы выступіць цяпер за кампенсацыю добрага імя падсудны гайнаўскага суда і да газет, і тэлебачання, ды ўсе ж яны не хацелі яму ўчыніць шкоду, а якраз памагчы змагацца з Установай. Нават установамі. Бо трапіў немалады беларус з падбеларускай мяжы ў сітуацыю вартую кафкаўскага героя Юзафа К. Установа *тыпавала* яго на злачынцу і злавіла. Арыштавала, засудзіла без судовага разбору і прыслала на хатні адрас загад аплаты за парушэнне польскага закону. У раённым судзе ў Гайнаўцы, аддзеле бельскага раённага суда, на спісках на дзвярах выключна такія справы — „без судовага разбору". Не запрашаецца на справу нават падсудны, паколькі ўсе справы для суда — *відавочныя*. Установа, званая Судом, вырашыла канчаткова справу на карысць Геня, даючы яму апраўдальны прыгавор. Ды да вырашэння справы шлях быў доўгі, і без дапамогі юрыста Генё, зусім бездапаможны, і не даў бы рады. Цяпер будзе змагацца за кампенсацыю за абнаслаўленне Установай, і за зварот „трампак". Бо новенькія былі, куплены ў краме ў Нараўцы два дні да таго, калі яму сарвалі іх з ног і адабралі як *corpus delicti*, хоць вартыя няшмат — толькі каля 16 злотых. Такія самуткія, у якіх хтосьці ўступіўся на польска-беларускую мяжу. Еўрасаюзную. Крокаў было пяць, а паўследу засталося. Хапіла, каб засудзіць Яўгена Лукшу з Баравых Нараўчанскай гміны Гайнаўскага павета.

Такіх кедаў за тыя 1 250 злотых, што меў заплаціць за „выкрачэнне", мог бы Генё куціць амаль сто пар. Такія ж носяць летам амаль усе жыхары Баб'яй-Гары, Пасек, Семяноўкі, Баравых, Медзвядзёў, Масева... Такія самыя, бела-сінія, з жоўтай падэшвай у аднолькавы ўзор, шнураваныя, з надпісам SR*CT на „тыльніку" і „языку". Кампазіцыя на падэшве — перарываныя хвалістыя лініі, паралельныя лініі і дробныя рыскі. 15 кастрычніка 2007 г. раённы гродскі суд палічыў вінаватым Яўгена Лукшу ў злачынстве — па артыкуле 49 „а" пар. 1, „што ў неакрэсленым часе ў ваколіцы памежнага знака 1532 у раёне службовай адказнасці пагранзаставы ў Семяноўцы парушыў мяжу дзяржавы супраць абавязваючым законам — перайшоўшы з Польшчы ў Беларусь і вярнуўшыся назад".

12 ліпеня 2007 г., вось якраз на Пятра і Паўла, над Белавежскай пушчай і навакольнымі ціхімі вёскамі заляталі былі верталёты, загудзелі машыны.

Добры адвакат — Пятро Юшчук — можа шмат!

Па вёсках заварушыліся памежнікі, а людзі перадавалі вестку: шукаюць чачэнца, які ў кедах нумар 8 прыйшоў у Польшчу. У той час Генё са сваёй сяброўкай апрануты быў больш па-святочнаму, хоць у гумовых чобатах, — хадзіў па сваім прыватным лесе (мае 5 гектараў пад Медзвядзямі), па ўрочышчы Марушка, што над Семяноўскім вадасховішчам. Сем кіламетраў ад мяжы. Надзеў новенькія кеды, купленыя ў Нараўцы ў краме пані Стульгісавай, пасля поўдня, калі ехаў з Медзвядзёў ад свае сяброўкі Галі ў сваю вёску Баравыя на ровары. Каб там у сваёй клуні прасушыць зелле і ўзяць малака для сяброўчынай свякрухі ад жыхаркі Баравых, што трымае адзіную ўжо ў ваколіцы карову. У той час маёр Артур Б. пытаўся ўжо ў Галі Мядзведзь у Медзвядзях, дзе ёсць Генё Лукша, а хвіліну пасля ў Баравых разглядаў аднолькавыя кеды на нагах хлопцаў і дзядзькоў з Масева і Баравых што крыху святочна расселіся на лаве пад старой ліпай. Спытаўся, ці не былі яны на мяжы і паведаміў, што страж шукае ўласніка кедаў нумар 8. Генё паглядзеў на свае новенькія „трампатулы" нумар 10. А чаго ісці на тую мяжу з Беларуссю? Быў у той ваколіцы 15 гадоў таму, мераўшы ўзровень грунтавых вод для Інстытута лясніцтва ў Варшаве...

У той час (каля 15 гадзіны) сабака, пазычаны з Міхалова з праваднікам у пагранічнай форме разам з пагранічнікам у цывільным ішлі следам асобы, якая на 5 метраў некалькі гадзін раней парушыла еўрасаюзную мяжу. Была таксама зробленая гіпсавая адліўка з аднаго следу — адбітку верхняй паловы правай падэшвы. Сабака, як напісаў ў пратаколе пагранічнік, унюхваўся з ахвотай і бядзёра ішоў следам. Спрыяла надвор'е — было горача, нізам парна; час „нюхавай працы" сабакі склаў 6 гадзін. Пятляў ён па пушчы, спыніўся каля стаянкі „Пад дубамі" каля Баб'яй-Гары. Асабліва адзначыў знойдзеныя „трафеі" — парожнюю пластмасавую бутэльку з-пад напою „Спрайт" з нявысахлым яшчэ донцам і паперчыну ад цукерка. Пра здабычу пагранічнікі адзначылі ў пратаколе, ды не ўзялі з яе адбіткаў. Як тлумачыліся пасля ў судзе — не з'яўляюцца яны паліцыянтамі, і ніколі ім не давялося і не ўмеюць забяспечваць такіх слядоў. Сабака давёў пару пагранічнікаў 200 метраў да вёскі Семенякоўшчына, у народзе званай Медзвядзямі, ды разгубіўся. Як зафіксаваў ягоны праваднік, „страціў арыентацыю", паколькі не мог засяродзіцца — зацікавіўся вясковымі сабакамі. Пагранічнікі спынілі следапытную працу ў Медзвядзях і пазванілі шэфству па паступныя распараджэнні. Стомленага сабаку павялі на суседскі падворак напіцца.

З пратакола: „Праз нейкі час у вёску прыбылі на двух самаходах службоўцы з Пагранзаставы ў Семяноўцы і падбеглі да мужчыны, які момант раней выйшаў з аднае з гаспадарак. Мы паехалі ў гэтае месца (*сабаку падвезлі на машыне ад суседа — М. Л.*). Чуючы запах слядоў па якіх ішоў, сабака адзначыў вышэйзгаданага мужчыну сярод іншых асоб, аббрэхваючы яго і выказваючы зацікаўленне ім".

Генё быў спынены на ровары, выязджаючы з падворка свае сяброўкі (зараз ад яго пачынаецца ўрочышча Марушка) — аддаўшы прывезенае з Баравых малако Галінай свякрусе, рушыў быў у краму за Марушкай па цыгарэты. „Іншыя асобы" — прыехаўшыя пагранічнікі, якія, злавіўшы першага нарваўшагася „веласіпедыста", паклікалі калег з сабакам, што нейкі час адпачывалі ў другой частцы прыпушчанскай вёсачкі.

— Я не бачыў нікога больш, апрача босага Геня ды пагранічнікаў, з якіх толькі адзін быў у мундзіры, — прызнаўся сведка Міхал Мядзведзь з Беластока, які якраз тады выйшаў з лесу. — Я быў адзіным „разявакам". Нікога нават на лавачках не было. Адно пасля Галя выбегла, крычаўшы, чаго ровар забралі. Разулі Геня, самі знялі боты, паставілі радочкам адзін каля аднаго. Далі панюхаць Геневу руку сабаку, і той моўчкі пакруціўся ды сеў задам на боты. Хто гэта бачыў, каб д..й паказваць след! Я пацікавіўся, чаму той сабака такі дзіўны, асалавелы. Праваднік адказаў, што стаміўся ён.

Босага Яўгена Лукшу забралі ў Нараўку на допыты. Каля 22 гадзіны стала турбавацца яго сяброўка Галя: не ўзяў з сабою лякарстваў ад сэрца, якія павінен прымаць. Прывезлі яго каля поўначы босага.

Праз два месяцы Яўгену па пошце прыйшоў загад заплаціць штраф з іншымі судовымі аплатамі за нелегальнае перасячэнне мяжы. Не ведаў, куды дзецца. Не разумеў, у чым справа. Папрасіў дапамогі ў Пятра Юшчука.

Акруговы суд у Беластоку 12 сакавіка 2008 г. выдаў прысуд, адмяняючы прыгавор штрафу раённага суда, і перадаў справу для новага разгляду ў Гайнаўку. Выслухаў перш за ўсё сведкаў. Прысутнымі былі не толькі людзі, якія бачылі ў той дзень Яўгена ў зусім іншым месцы, але і журналісты з розных газет ды тэлебачання. У тэлебачанні каментатар меркаваў: „Добры адвакат можа шмат. Паказаў гэта працэс. Міжвольны герой першых старонак газет абараніўся ад абвінавачання. Пры нагодзе аказалася, якія кволыя былі яго падставы. Што тут цікавага? Гісторыя, якіх сотні разглядаюць без разгляду гродскія суды. Усё ж яна асаблівая якраз таму, што выклікала такое зацікаўленне медыяў! Абутак і чалавечыя тыпы дадалі гэтай гісторыі непаўторнай каларытнасці..."

Памежная страж, якую таксама прадстаўлялі юрысты, не абскардзіла канчатковага вырашэння суда, які апраўдаў Яўгена Лукшу. Геню варта пазмагацца яшчэ за кампенсацыю ад яе ды вяртанне новенькіх кедаў, што ляжаць там, таксама ў нічым невіноўныя, як *corpus delicti*.

31.08 — 06.09

(22.03. — 20.04.) Будзеш спакайнейшы, гарманічны з атачэннем, схільны да кампрамісу і згоды. Калі чагосьці баішся, гавары аб гэтым адкрыта. З 5.09. непатрэбная рызыка і захапленне рэчамі нявартымі ўвагі. Маючы надта вялікія патрабаванні да іншых, можаш прапусціць доўгачаканы шанц.

(21.04. — 21.05.) Прэч з нудою ў спальні! Трымай вочы шырока адкрытымі, а прыкмеціш штосьці, што ў будучыні вельмі табе прыдасца. Час багаты ў вопыт і прыгоды. Дома справы круцяцца вакол грошай.

(22.05. — 22.06.) Пабуджэнне, энергія, адвага і рашучасць. Рамантыка! У сардэчных справах дай волю жарсцям! На працы крыху перабояў, але не трапляй у паніку. Чакае цябе мілы фінансавы сюрпрыз.

(23.06. — 23.07.) Ідэальны час на прапушчаны водпуск. Падарожжа прыемнае, мілая кампанія. Добры час і на парадкі ў паперах. Не раздзірай старых ран. З аптымізмам прымай усё што дзеецца навокал. Калі праз фірму перакоціцца бура, абміне цябе.

(24.07. — 23.08.) Ад 2.09. (аж да 09.09.) адкрыюцца перад табой новыя магчымасці, прыносячы нагоды добрага заробку. Дынамічна, працавіта і зацята — удасца дайсці свайго! (Пільнуй здабыткаў, каб праз тыдзень-два твая праца не пайшла дарам!).

(24.08. — 23.09.) Энтузіязм, энергія. Тое што маеш зрабіць заўтра, зрабі сёння. Пагадзі розум з пачуццямі, каб не страціць над усім кантролю. Удача ў фінансах можа цябе аж ашаламіць. Пані-Дзевы: не дапускайце ніякіх занядбанняў! Знакамітая форма (аж дзве першыя дэкады месяца!).

(24.09. — 23.10.) У пачуццях пастаў на шчырасць і спантаннасць. З вырашэннямі ў прафесійных справах пачакай да канца месяца. Увесь месяц ты ў фантастычнай форме. Цудоўна з сямейнікамі і сябрамі. Не купляй нічога неабдумана.

(24.10. — 22.11.) Паглядзі на сваё пачуццёвае жыццё халодным вокам — тады больш яго зразумееш. Твае фінансавыя рашэнні хай будуць адважныя, ды глядзі на рукі супольніку. Шмат змен, з якіх не заўжды будзеш задаволены. Не думай аб паразах, а трымайся таго, у чым ты добры. Гвалтоўныя пачуцці — і пры захапленнях, і расстаннях. Былая каханая асоба можа стаць тваім ворагам.

(23.11. — 22.12.) З 5.09 (да 09.09) не дзейнічай усляпую, дакладна трымайся правіл. Недахоп асцярожнасці, наіўнасць і вера ў тое, што справы афармяцца самі — могуць увесці цябе ў клопаты. Спалучэнне сяброўства з сексам можа цяпер не апраўдацца!

(23.12. — 20.01.) З 05.09. (да 09.09.) захочацца табе ўзяцца за праекты, якіх час яшчэ не прыйшоў. У каханні можаш кідацца паміж прагай і нянавісцю. У працы меціш высока, неўзабаве дасягнеш таго чаго чакаеш. Шчасце і ўдачы — увесь месяц!

(21.01. — 19.02.) Не раскідвайся грашыма! Выкарыстай прапанову выезду за мяжу. Самотныя Вадалеі пазмагаюцца з поспехам за сваё шчасце. Можа адкрыцца ў табе аздараўляльная моц!

(20.02. — 21.03.) Зразумееш цяпер, што ў тваёй пары для цябе найважнейшае. Не кажы, што ў тваім узросце ўжо запозна на змены! Падгоніш хвасты ў кампанейскім жыцці. Узрасце твой апетыт не толькі на каханне, але і на грошы! Плануючы (так працаўнік, як і шэф) усё палічы, каб не страціць ні залатоўкі!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960